
ЗГОДА

ІНФАРМАЦЫЙНА-АНАЛІТЫЧНЫ ШТОТЫДНЁВІК
http://www.zgoda.f2s.com

№ 42 (220) 26 кастрычніка – 2 лістапада 2001 г.

ПО ПОВОДУ

ГОСУДАРСТВО БГУ



НАШ ВЕРНИСАЖ. «Три популярных [illegible]», художник АЛЕКСАНДР СДВИЖКОВ-ВОЛКОВ

АНТОСЬ САКОВИЧ

80-летний юбилей одного из старейших вузов страны — Белорусского государственного университета — выпал не на самые радостные для этого заведения дни. В соответствии с указом № 516 БГУ утратил ранее дарованные привилегии: неподчинение Министерству образования, отдельную строку в бюджете страны, а ректор университета потерял место в Совете министров. Да и само кресло под ним зашаталось.

Юбилеи

Днем рождения Белорусского государственного университета является 11 июля 1921 года, но отмечать юбилеи в июле, во время отпусков и студенческих каникул, глупо. Поэтому традиционно праздник университета устраивается в конце октября - начале ноября. Последний такой юбилей, 75-летие, был в 1996 году и запомнился небывалым размахом. Кроме внутрифакультетских мероприятий и торжественного собрания, 1 ноября на площадке на проспекте Машерова студенты устраивали представление своих факультетов, на открытой сцене проходило нечто вроде КВН, а вечером состоялся концерт (как сейчас принято говорить *«с участием звезд российской эстрады»*) в самом Дворце спорта.

Нечто подобное планируется и сейчас. Уже рекламируется по телевидению концерт группы «Чайф». Продаются билеты на футбольный матч между нашими и российскими попсовиками на субботу 27 октября. 29-го будет ректорский банкет. Состоятся и студенческие представления возле Дворца спорта, а также две ночные дискотеки (во Дворце спорта и в выставочном центре на Машерова). Однако былой радости от этого не ощущается.

Взлет

Взлет БГУ проходил стремительно. До 1996 года университет, как и вся бюджетная сфера в бывшем СССР, медленно дряхлел и хирел. У государства не было денег на поддержку загибающейся белорусской науки. Но тут началась единственная по-настоящему горячая весна 1996 года. Политологи хором заговорили про феномен молодежного сопротивления: 30-тысячные демонстрации на День Воли, 2 апреля и «Чарнобыльскі шлях», по крайней мере, на половину состояли из студентов минских вузов. И деньги на науку в отдельно взятом университете резко нашлись.

Для начала в БГУ сменили ректора. По слухам, ректор Капуцкий отказывался отчислять из университета арестованных во время «горячей весны» студентов. Одновременно отменялся сам принцип университетской автономии. Ректор фактически назначался президентом, процесс выборов через Ученый совет превратился в пустую формальность.

Место Капуцкого занял протеже Лукашенко Александр Козулин. Параллельно заменили неблагонадежных деканов. В общем, в университете, как в зеркале, отразились все метаморфозы, происходившие со страной в 1996 году.

Чтобы профессора с преподавателями не возмущались утрате университетских вольностей, им была кинута кость в виде «пряничных» пунктов указа №342 от 29 августа 1996 года. БГУ получал статус *«ведущего вуза страны»*, выводился из подчинения Министерства образования, ректор БГУ по должности входил в состав Совета министров. Университет получал отдельную строку в бюджете страны плюс кучу экономических послаблений. Зарплаты преподавателей автоматически умножались на коэффициент 1,7.

Бюджет как рог изобилия

В должности ректора Александр Козулин за пять лет ударными темпами построил государство в государстве. БГУ – это не просто университет, а несколько десятков юридических лиц (в 1999 их было 30). Стратегию развития БГУ разрабатывает специальный Отдел перспективного развития и аналитической работы. При Белгосуниверситете работает модельное агентство Саши Варламова, радиостанция *Unistar*. Отдел по делам культуры курирует театр «На балконе» (кстати, в этом году он участвовал в знаменитом Эдинбургском фестивале) и команду КВН. Центр международных исследований выполняет заказы Совмина. Только отдел международных связей принес в прошлом году около 700 тысяч *Usd* в качестве оплаты обучения иностранных студентов.

Еще одной важной доходной статьей являются наши студенты-платники. Все пять лет их численность росла. И теперь они составляют от четверти до половины студентов, в зависимости от популярности специальности и факультета. Плата за обучение в БГУ одна из самых высоких в Беларуси. В этой связи было несколько громких скандалов – в 1998 и 1999 годах. В 1998 студентов-платников уведомили в сентябре, что до начала следующего месяца они обязаны изыскать сумму к оплате раза в два большую, чем было указано в контрактах. Профсоюз промолчал, а студенты заплатили. В 1999 в ситуации, когда реальный курс доллара резко ушел в отрыв от цифр Нацбанка, БГУ учредил свой собственный курс! Оплата по факту опять выросла и опять почти на 100 процентов.

Во многом благодаря тому, что на платном отделении юрфака (самого дорогого факультета, наряду с ФМО) училась дочь минского прокурора Куприянова, на этот раз студенческие протесты приобрели организованную форму. Прокурор внес протест на незаконные действия администрации БГУ, начался конфликт ведомств. В разборке между прокурорскими и университетскими

➲ *Окончание на стр. 7*

ТЕРРОР

Разбушевавшийся микроб

ОЛЕГ ПЕТРОВ

Вся Америка в страшном смятении: чуть ли не ежедневно выявляются новые случаи заражения сибирской язвой, споры которой анонимные террористы рассылают по стране в конвертах. Политологи говорят, что эра биотерроризма началась.

Еще Эдгар По в «Маске красной смерти» нагнал на публику страху рассказом о том, как вирус косит жителей вымышленного средневекового королевства. Герберт Уэллс в рассказе «Бацилла» повествует про некоего анархиста, который собирается отправить в тартарары Лондон, проглотив микроб экзотического вида холеры. Или вот непобедимый Джеймс Бонд. Однажды автор бондианы Флеминг заслал своего героя в Швейцарию, где пронырливые агенты КГБ готовили операцию против мясопромышленности Соединенного королевства. Они додумались запустить в британские птичники кур, зараженных каким-то микробом, дабы устроить там мор и подорвать экономику.

Бактериологическая война знакома человечеству еще со времен Великого потопа. Четвертая египетская казнь, которой Яхве покарал египтян, представляла собой атаку полчищ мух и вшей – переносчиков многочисленных заболеваний. Там же можно найти сообщение о том, как посланный все тем же Яхве в лагерь ассирийцев ангел распространял там чуму, в результате чего дуба дали 185 000 человек. Если же углубиться в историю, то она полна примеров бактериологических войн.

Обласканный античными историками Александр Македонский забрасывал осажденные города трупами людей, погибших от инфекционных заболеваний. В XV веке при осаде Феодосии татары перебрасывали через стены города тела умерших от чумы. В 1763 году, когда вспыхнуло восстание ирокезов, английский генерал Джеффри Эмхертс придумал ловкий трюк: разбрасывать вокруг стоянок индейцев одеяла, зараженные возбудителями оспы. Неудивительно, что спустя какое-то время, когда в тех же местах началась американская революция, Джордж Вашингтон, ожидая от англичан подобного подвоха, разослал по частям циркуляры, запрещающие солдатам собирать подозрительную продукцию легкой промышленности.

Вообще до тех пор, как в XVII веке Антоний Ван Левенгук увидел через прибор, прообраз нынешних микроскопов, бактерии, мир содрогался при мысли об эпидемиях. Джина бактериологической войны выпустили из лампы немцы во время первой мировой войны. Командование немецкой армии санкционировало распространение сапа и сибирской язвы среди скота, который Франция закупала в Латинской Америки. В Санкт-Петербурге предки нынешних ментов раскрыли берлинского агента, который занимался тем, что разводил крыс, прививая им чуму. Подопытных он намеревался выпустить в городскую канализацию.

Но это была лишь прелюдия. Во время фашизма, чья расовая античеловеческая доктрина благословляла любые деяния, биологическая война едва не стала реальностью. В начале 30-х немецкий ученый Люстин представил руководству Рейха развернутый доклад о возможностях бактериологического оружия. В 1943 году под Познанью был основан специальный центр по производству бактериологического оружия. Но к этому времени в данной области немцев далеко обошли японцы.

Там по инициативе генерал-лейтенанта Сиро Исии под вывеской управления по снабжению и профилактике Квантунской армии было создано секретное учреждение – отряд 731. При отряде действовал ряд лабораторий, где шло натуральное производство возбудителей эпидемических заболеваний – крыс, грызунов, чумных блох, микробов и т.п. Как пишет японский публицист Сейти Мориммура, бактерий на складах отряда 731 скопилось столько, что при идеальных условиях можно было уничтожить все человечество. Помешало наступление Красной армии. Впрочем, когда в 1949 году руководство отряда 731 судили в Хабаровске, подсудимые признали, что успели попрактиковаться не только на пленных. В 1939 году во время конфликта на Халхин-Голе несколько фарфоровых бомб, начиненных микробами чумы, упали в тылу Красной Армии. В 1940 году на территорию, которую контролировали партизаны Мао Цзедуна, были сброшены капсулы с чумными блохами.

Между прочим, в Хабаровске судили далеко не всех. Отсутствовал главный организатор всех преступлений отряда 731 Сиро Исии. Он был тайно вывезен американцами на секретную базу в штате Юта, где до самой смерти, до 1959 года, преспокойно работал консультантом в лаборатории Пентагона над новыми программами бактериологических войн.

Впрочем, и у СССР было рыльце в пуху. С 1946 года еще Берией была запущена программа «Биоаппарат» по созданию некоего сверхмощного бактериологического оружия. ЦРУ утверждает, что масштабы программы, которая продолжалась до 1992 года, были в несколько раз больше, чем ее американский аналог. Между прочим, и

➲ *Окончание на стр. 5*

АНЕКДОТ-С


– Как математически доказать, что президентская линия есть прямая?

– Каждая точка этой линии – точка перегиба. Поэтому в каждой точке вторая производная равна нулю, а это – характеристическое свойство прямой.

***

Белорусский оппозиционер бросается к машине американского посла и прокалывает шину. *«Воздухом свободы подышать захотелось!»* – объясняет он свой поступок в милиции.

ХИТ-ПАРАД ГЛУПОСТИ




«Баталии будут происходить и в гремучих лесах, и в городах, и в непролазных болотах»

А. Бурдыко, «Компьютерная газета», 16.10.01



«Данный декрет должен быть согласован с нами, дабы им никто не воспользовался»

Н. Дубовик, депутат ПП НС, 17. 10. 01



«Я отдал предпочтение управленцу Мясниковичу. Мне нужен – да и вам тоже – управленец, который знает, где лежит, как взять, как поставить вопрос»

А. Лукашенко, в НАН, 22. 10. 01

НАВІНЫ

Прапанова. Аб'яднаная грамадзянская партыя прапанавала Аляксандру Лукашэнку вызваліць з турмы дэпутата Вярхоўнага Савета Андрэя Клімава. Гэтым кіраўнік дзяржавы можа на практыцы давесці, што гатовы праводзіць палітыку «лібералізацыі і дэмакратызацыі», – мяркуюць у АГП. Прадстаўнікі АГП таксама заклікаюць прэзідэнта паўплываць на спыненне крымінальных справаў Вадзіма Стэфаненкі, Сяргея Маторанкі і Сяргея Няроўнага з Крычава, Наталлі Брэль з Рэчыцы і Пятра Мігурскага з Шклова.

БНФ. 15-16 снежня адбудзецца пяты з'езд партыі БНФ. Традыцыю яго дэлегатаў складуць сябры «Маладога фронту». Як паведамілі ў прэсслужбе БНФ, гэткае шырокае прадстаўніцтва «Маладога фронту» звязана са значным уплывам гэтай структуры на палітычнае жыццё краіны.

Пажар. Больш за чатырыста чалавек былі эвакуяваны са сталічнага ўнівермага «Беларусь» 21 кастрычніка. Паводле інфармацыі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, універмагу пагражаў пажар. Задымленне ўзнікла ў секцыі абутку ў выніку кароткага замыкання ізаляцыі свяцільні пад столлю. Выпадкова ў час здарэння ў будынку знаходзіліся два курсанты Камандна-інжынернага інстытута Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. Ва універмагу абвесцілі пра тэхнічны перапынак, праз дваццаць хвілін засталіся толькі ратавальнікі. Аднак, сур'ёзных наступстваў здарэнне не мела. Свяцільні ва універмагу «Беларусь» эксплуатуюцца больш за дваццаць гадоў.

Халакост. Мерапрыемствы, прысвечаныя Халакосту, распачынаюцца ў Беларусі 22 кастрычніка. Ініцыятар – Саюз беларускіх яўрэйскіх арганізацый і грамадаў. У памяць пра шэсць мільёнаў яўрэяў, што загінулі ў час другой сусветнай вайны, даследчыкі прачытаюць цыкл лекцый. Плануюцца сустрэчы ветэранаў. На задуму арганізатараў, мерапрыемствы стануцца сімвалам памяці пра ўсе пяцьдзясят мільёнаў чалавек, якія загінулі ў час апошняй сусветнай вайны.

Выстава. Персанальная выстава Аляксея Марачкіна пад назвай «Разам з «Пагоняй» адкрылася 24 кастрычніка ў мінскім Палацы Мастацтваў. Выстава прымеркавана да 60-годдзя мастака. Асаблівасцю выставы стане ўдзел у ёй сяброў мастацкай суполкі «Пагоня». Гэтай восенню суполка адзначыла сваё дзесятыя ўгодкі. Аляксей Марачкін – першы кіраўнік «Пагоні».

Прафсаюзы. «Не дапусціць антыканстытуцыйных папраўак у Працоўны кодэкс» патрабуюць у адкрытым лісце старшыні двух прафсаюзаў Вытворчага аб'яднання «Беларуськалій». Незалежны прафсаюз гарнякоў і Беларускі прафсаюз работнікаў нафтавай прамысловасці рэпрэзентуюць дваццацітысячны калектыў «Беларуськалію». Нязгоду прафсаюзаў выклікалі змены ў законе аб падаходным падатку з фізічных асобаў. Новы варыянт закону прадугледжвае ўтрыманне падаходнага падатку з сумаў выходных дапамогаў. На думку сяброў прафсаюзаў, закон значна зніжае жыццёвы узровень рабочых.

Гандаль. Мінчукі аддаюць перавагу міні-рынкам у сваіх мікрараёнах. Такі вынік дало апытанне, наладжанае Мінскім навукова-даследчым інстытутам сацыяльна-эканамічных і палітычных праблемаў. Паводле апытання, Камароўскі рынак згубіў сваё абсалютнае лідэрства. Камароўскі і Ждановіцкі рынкі сёння наведвае палова жыхароў сталіцы. Найбольшай папулярнасцю міні-рынкі карыстаюцца ў пенсіянераў.

Амністыя. Амністыі капіталаў у наступным годзе тэрмінам на год не выключыў Аляксандар Лукашэнка. Пра гэта ён паведаміў на сустрэчы з прадстаўнікамі бізнэсовых колаў краіны 19 кастрычніка. У наступным годзе, з яго словаў, урад дасць яму на зацвярджэнне праграму дзеянняў па лібералізацыі эканомікі, змякчэнні падаткавага ціску і стварэнні спрыяльнага інвестыцыйнага клімату. А. Лукашэнка пацвердзіў, што ў наступным годзе адбудзецца скарачэнне ліцэнзаваных відаў дзейнасці да 10–12 (цяпер іх 150). Колькасць праверак на прадпрыемствах будзе абмежавана дзвюма на год.

План. Сёлета не будзе выкананы дзяржаўны заказ па зборы ільнавалакна. Нарыхтоўчыя прадпрыемствы могуць здаць сёлета прыкладна 36 тысяч тонаў ільновалакна пры плане 50 тысяч. У асобных абласцях на палетках засталося 20–25% ільнотрасты, у той час як яе патрэбна было вывезці да 1 кастрычніка. Разам з тым, на складах ткацкіх прадпрыемстваў ляжыць незапатрабаваная гандлем ільняная тканіна ў колькасці, якая складае больш як трохмесячны аб'ём вытворчасці.

Інтэрнэт. Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу расшчодрыўся на ўласны сайт http://www.sovrep.gov.by/. Сайт мае старонкі – структура і склад, сакратарыят, заканапраектная праца і іншыя. На гэты час сайт наведала больш за 100 карыстальнікаў.

Вандалізм. Вандалы знявечылі бронзавую скульптуру «Дзяўчынка з парасонам» у Міхайлаўскім скверы ў цэнтры беларускай сталіцы. Імі быў выкарыстаны трактар, пра што сведчаць сляды пратэктару. На думку скульптара Уладзіміра Жбанава, прычынай вандалізму ёсць людская абыякавасць: скульптура раней ужо была ахвяраю вандалаў, але яе ўдалося аднавіць.

Авіяцыя. Кіраўніцтва саюза Беларусі і Расіі не выключае аб'яднання авіякампаніяў «Белавія» і «Аэрафлоту» – паведаміў прэс-сакратар дзяржсакратара саюза Іван Макушок. Ён распавёў, што створаны інвестыцыйны камітэт саюзнай дзяржавы, які разгледзе перспектывы фінансавання беларуска-расійскіх праектаў. Сп. Макушок паведаміў, што адным з іх ёсць стварэнне сумеснага паветранага праекту, у сувязі з чым не выключаецца аб'яднанне двух буйных авіякампаніяў.

Тытунь. Спецыяльная тытунёвая пошліна ўводзіцца ў Беларусі з 19 кастрычніка. Пошліна складае 30 адсоткаў мытнай пошліны на тытунёвыя вырабы. Пошліна накладаецца пры ўмове, калі кантрактная цана вырабу не перавышае дваццаці шасці амерыканскіх цэнтаў за

ПОДРОБНОСТИ

АДДЗЕЛ ІНФАРМАЦЫІ

Партыйныя разломы

8–9 снежня БСДП (НГ) мае намер правесці свой 6-ы з'езд. Нечарговы, але справаздачна-выбарчы.

Ці будзе гэта з'езд усёй партыі, ці толькі часткі, чым ён завершыцца – сказаць зараз цяжка. Аднак ясна, што ўнутраныя супярэчнасці ў партыі, не рэгіянальных структурах надзвычай абвастрыліся. Аб тым сведчыць і заява Крычаўскай гарадской арганізацыі. Адрасавана яна была ЦК з прапановай вынесці праблему на пленум. Аднак, паколькі пажаданне гэта было праігнаравана старшынёй БСДП Мікалам Статкевічам, крычаўскія сацыял-дэмакраты прынялі рашэнне надаць заяве публічнасць.

«Мы, на жаль, – гаворыцца у заяве, – *абавязаны засведчыць фіктыўнаўнасць дзейнасці Магілёўскай абласной арганізацыі, якая мяжуе з ашуканствам, і скрайні аўтарытарызм старшыні абласной арганізацыі А. Бярнацкай».* Большасць раённых суполак, па сведчанню крычаўскіх эсдэкаў, байкатуюць паседжанні абкама. Па іх меркаванні, менавіта нежаданне або няўменне абласнога камітэта весці аб'яднаўчую і стваральную працу з суполкамі прывяло да крызісу абласную арганізацыю.

У якасці прынцыповых праяў крызісу называюцца: прыняцце рашэннаў кіраўніком абласной арганізацыі аднаасобна ці ў супольніцтве адным-двума бліжэйшымі паплечнікамі, закрытасць расходаў сродкаў, келейнасць рашэнняў аб накіраванні членаў партыі ў замежныя камандзіроўкі, падбор кадраў па прынцыпе асабістай адданасці, рашэнне правесці не адпавядаючую статуту перарэгістрацыю членаў Магілёўскай гарадской арганізацыі пры адначасовым нежаданні правесці дзяржаўную перарэгістрацыю абласной арганізацыі ва ўпраўленні юстыцыі.

Як вынік: крычаўскія сацыял-дэмакраты выказалі недавер старшыні абласной арганізацыі Аксане Бярнацкай. Для паўнаты інфармацыі адзначым, што апісаная вышэй сітуацыя склалася ў адной з тых паралельных структур у БСДП, якія ствараліся Мікалам Статкевічам дзеля сваёй падтрымкі. ■

РЭГІЁНЫ

Гомель. Гомельскі лікёра-гарэлачны завод парадаваў сваіх прыхільнікаў новым гатункам гарэлкі – «Будзьце здаровыя». Новая гарэлка мае хлебны прысмак. Ці плануюць выпускаць гарэлку з прысмакам сала ці цыбулі – пакуль не паведамляецца. Але Гомельскі лікёра-гарэлачны завод распачаў выпуск яшчэ аднаго адмысловага гатунку. Цяпер на дэсэрт можна спажыць гарэлку «Палессе»: яна з дадаткамі кветак ліпы ды мёду.

Віцебск. На тэрыторыі Віцебскай вобласці ёсць 76 кропак, дзе пахаваныя парэшткі памерлых ад сібірскай язвы жывёлаў. Паводле санітарнай практыкі, гэтыя кропкі лічацца патэнцыйнымі агменямі ўзнікнення і пашырэння эпідэміі, паколькі вірус сібірскай язвы жыве ў зямлі больш за 100 гадоў. Таму ўсе гэтыя кропкі агароджаныя плотам і падлягаюць пільнаму кантролю. Двойчы на год у прылеглых гаспадарках праводзіцца вакцынацыя хатняй жывёлы, цяпер ідзе другая – восеньская. Апошні выпадак хваробы на тэрыторыі вобласці быў зафіксаваны ў 1995 годзе – у Полацкім раёне.

Быхаў. Крымінальную справу па артыкуле 340-м Крымінальнага кодэксу завялі на настаўніцу адной з быхаўскіх школаў, якая даслала сябробцы па пошце канверт з белым парашком. Жартаўніца падпісалася імем Усамы бен Ладэна. Пракуратура разгледзела ў жарце прыкметы злачынства – наўмысна ілжывае паведамленне пра небяспеку, якое прадугледжвае пакаранне ад 5 гадоў пазбаўлення волі.

Клічаў. Рашэннем суда адноўлена на працы выкладчыца Клічаўскага аграрна-тэхнічнага каледжа Людміла Гушча, якую адміністрацыя гэтай навучальнай установы звольніла за ўдзел у незалежным назіранні пад час прэзыдэнцкіх выбараў. Суд палічыў рашэнне дырэктра каледжа беспадстаўным . Зараз яму прыйдзецца ў поўнай аднавіць палітычна ненадзейнага выкладчыка на працы, але і выплаціць грашовую кампэнсацыю за вымушаны прагул у памеры 25 тысячаў беларускіх рублёў.

DESAPARECIDOS

АНТОСЬ САКОВИЧ

Сплошные вопросы

В среду, 24 октября, в Верховном суде начался закрытый процесс по делу банды бывшего бойца «Алмаза» Валерия Игнатовича. Среди прочего, Игнатовичу вменяется в вину похищение оператора ОРТ Дмитрия Завадского.



Тем временем, делом Завадского, похоже, заинтересовались не только в Беларуси, но и в России. В понедельник в здании Государственной думы прошли общественные слушания, посвященные исчезновениям в Беларуси и конкретно исчезновению оператора крупнейшего российского телевизионного канала. На слушаниях выступал и представитель белорусской стороны – Павел Шеремет.

Инициаторов общественных слушаний – депутатов Думы от фракций СПС и «Яблока» – очень заинтересовал чеченский период жизни Валерия Игнатовича. Что делал в мятежной российской окраине бывший боец отряда «Алмаз» МВД Беларуси и кто его прикрывал из российских и белорусских высокопоставленных чиновников – вопрос до сих пор открытый. Скорее всего, минский судебный процесс раскрытию этой тайны не поспособствует. По уже сложившейся белорусской традиции, он пройдет за закрытыми дверями, без доступа в зал заседания не только журналистов, но и родственников обвиняемых.

Второй больной и безответный вопрос в этом деле: жив ли оператор ОРТ, если нет, то где похоронен? Следствие умудрилось передать уголовное дело в суд, не потрудившись сказать родственникам журналиста, что случилось с Дмитрием Завадским. А значит, три проклятых вопроса белорусской современности *«Где Захаренко? Где Гончар? Где Завадский?»* по-прежнему актуальны. ■

БІЗНЭС

ТАЦЬЦЯНА ПАПОВА

Размова па сутнасьці

24 кастрычніка ў Менскім сталічным прэс-клюбе абмяркоўвалася роля бізнэс-асацыяцыяў у разьвіцьці дыялёгу паміж прадпрымальнікамі й ворганамі дзяржаўнае ўлады.

У якасьці першых выступалі прадстаўнікі Беларускае канфэдэрацыі прамыславікоў і прадпрымальнікаў і Беларускае навукова-прамысловае асацыяцыі. З пазыцыяў улады выказваліся дэпутат Палаты прадстаўнікоў Ул. Навасяд і намесьнік міністра эканомікі А. Тур. У спакойных, амаль нефармальных абставінах яны здольныя знайсьці кампрамісы па шмат якіх пытаньнях.

Перадусім абмеркавалі новага прэм'ера. Дэпутат прызнаўся, што галасаваў за кандыдатуру Навіцкага толькі таму, што ягоная праграма эканамічных пераўтварэньняў падалася палатніку досыць разумнай.

Дэпутат ўважае стасункі сваіх калег, якія займаюцца заканатворчасьцю, зь бізнэсоўцамі, якія пасьля змушаныя гэтым законам падпарадкоўвацца, за вельмі важныя. Зь ягоных словаў вынікае, што цяперашняя Палата прадстаўнікоў проста чакае, калі прамыславікі прыйдуць да яе лабіраваць свае інтарэсы. Практыка лабіраваньня лепш, чым прыняцьце законаў з заплюшчанымі вачыма ці наданьне статусу законаў прэзыдэнцкім дэкрэтам. Ул. Навасяд заявіў, штo ніколі не галасуе за прынясцьце пастановаў па бацькавых паперах, бо яны ня могуць быць карыснымі *a priori*.

Згадвалі нядаўнюю сустрэчу прамыславікоў з прэзыдэнтам. Бізнэсоўцы, якім пашчасьціла зьвяртацца да бацькі асабіста, адзначылі, што Лукашэнка інфармаваны аб стане справаў у эканоміцы дзяржавы вельмі павярхнева. Менавіта таму спачатку ён размаўляў з прысутнымі як непасрэдны начальнік з лайдакамі й ханыгамі-працаўнікамі. Пасьля, праўда, яму давялося трошку прыпыніцца бізнэсоўцаў, але гэта была хвілінная слабасьць.

Цяпер улада ставіцца да грамадзкіх аб'яднаньняў, якія лучаць і бізнэсоўцаў, вельмі насьцярожана. Яна бачыць ў іх сваіх апанэнтаў, аднак ёй давядзецца перагледзець свае дачыненьні з грамадзкасьцю пасьля разьдзяржаўленьня некаторых сваіх прадпрыемстваў. Удзельнікі прэс-клюбу сышліся на тым, што працаўнікі цяперашніх дзяржпрадпрыемстваў зоймуць больш актыўную гармадзянскую пазыцыю, калі зьменяць свой статус.

Выцiснутага з прэзыдэнта абяцаньня хаця б часткова акцыянаваньня недастаткова. Паслабіўшы падаткавы цяжар, таксама справу ня выправіш. Эканоміка прыпёртая да такое сьценкі, што літаральна ў пачатку наступнага году давядзецца-такі запускаць друкарскі станок. І ўжо зусім не цікава, як Лукашэнка будзе камэнтаваць такі крок. Цікава, колькі яшчэ засталося да самае нізкае кропкі эканамічнае ямы, і як пабудаваць лесьвіцу, каб пасьля выбрацца на паверхню. ■

РАЗБОР ПАЛЁТАЎ

ЗОЛАТА «ХАРТЫІ»

АЛЯКСАНДАР КАВАЛЬСКІ


У канцы мінулага тыдню каардынатар «Хартыі'97» Зьміцер Бандарэнка ладзіў у сваім доме прэсавую канфэрэнцыю з фуршэтам. Тэма прэс-канфэрэнцыі — абвяржэньне скандальнага інтэрвію Аляксандра Фядуты інфармацыйнаму агенцтву *Interfax*, у якім каардынатары «Хартыі'97» былі абвінавачаны ва *«ўзурпацыі й фінансавых махінацыях»*.

Нагадаем, што інтэрвію Аляксандра Фядуты *Interfax*'у было насычана самымі рознымі абвінівачваньнямі ў адрас «Хартыі'97»: шантаж незалежнай прэсы, гандаль характарыстыкамі для зьехаўшых за мяжу, што пацьвярджаюць іхны статус палітычнага ўцекача, і г. д. Зьміцер Бандарэнка ня стаў абвяргаць кожнае зь іх, адразу зазначыўшы, што інтэрвію *«хлусьня ад першага да апошняга слова, таму камэнтаваць я гэта ня буду»*.

Затое каардынатар «Хартыі» больш падрабязна распавёў пра сваю вэрсыю таго, чаму апошнім часам у спадара Фядуты назіраецца нястрымны зуд палічыць чужыя гранты. На думку Зьміцера Бандарэнкі, улада зараз стварае сваю *«кішэнную апазыцыю»*, туды й хоча трапіць адзін з актывістаў грамадзкага аб'яднаньня «Яблык» Аляксандар Фядута. *«Складана канкураваць з «Хартыяй» справамі. «Хартыя» правяла больш за 250 пікетаў па абароне зьняволеных і прысьвечаных зьніклым. Таму трэба паліваць ужо існуючую апазыцыю»*.

Яшчэ адзін актывіст і сябра аргкамітэту «Хартыі'97» Мікалай Халезін падзяліўся з журналістамі сваімі думкамі на гэты конт: *«Па маіх адчуваньнях – гэта распрацоўка Саўбеза»*. Цяпер, калі раптам каго-небудзь з актывістаў «Хартыі» (Саньнікава, Бандарэнку ці самога Халезіна) знойдуць з праламанай галавой, то з боку гэта будзе выглядаць як фінансавыя разборкі. Калі ж знойдуць у такім непрыемным стане Аляксандра Фядуту, то зноўку падазрэньні падуць на «Хартыю».

На пытаньне, ці падтрымліваюць хартысты ініцыятыву Мікалая Статкевіча аб стварэньні адмысловай камісыі па праверцы расходваньня фінансаў апазыцыйнымі партыямі й арганізацыямі, Зьміцер Бандарэнка адказаў, што *«дапамагаць Саўбезу й ягоным агентам»* яны не зьбіраюцца. Затое Бандарэнка параіў самому Статкевічу, калі той выступае за фінансавую празрыстасьць, раскрыць крыніцы дапамогі БСДП, асабліва зважаючы на тое, што фінансаваньне палітычных партыяў з-за мяжы у нас забаронена.



Хартысты ня вельмі баяцца, што *«інфармацыйная вайна з боку рэжыму»* можа неяк паўплываць на замежныя фундацыі, сапсаваўшы ўражаньне ад беларускіх грантаатрымальнікаў. У раскраданьні заходняй дапамогі абвінавачвалі ў свой час і сэрбскі рух *«ОТПОР!»*, але безвынікова. Увогуле рэпутацыя той ці іншай арганізацыі ствараецца гадамі, і намаганьнямі аднаго Аляксандра Фядуты разбурыць яе немагчыма. Тым болей, што спадар Фядута, на думку Мікалая Халезіна, дапусьціў тую ж памылку, што й прэзыдэнт Лукашэнка на мінулых выбарах. Адзін сказаў, што за яго галасавала 75 адсоткаў выбаршчыкаў, а другі кажа пра 24 мільёны скрадзеных даляраў за шэсьць гадоў. Тым часам, як сама фінансавая дапамога беларускім *NGO* склала, напрыклад, за 2000 год каля мільёна, а ўсім незалежным мэдыям – каля трох мільёнаў. Карацей, як зазначыў Мікалай Халезін: *«Дзе факты? Дзе прозьвішчы? Так рэпутацыі ня рушацца»*. ■

СЭКТАР ГАЗА

Трэба часьцей сустракацца

ТАЦЬЦЯНА ПАПОВА

Палатнікі ня кожны дзень выбіраюцца на экскурсыі за кошт запрашаючага боку. І ня толькі таму, што мала хто гатовы плаціць за ўсю тусоўку. У дэпутатаў заўжды безьліч асабістых справаў, якія вырашаюцца цягам працоўнага дня.

Янчэўскага нядаўна прыжучылі за адлыньваньне ад плянарных паседжаньняў. Севу можна зразумець. Неўтаймаваны тэмпэрамэнт колішняга лукамолаўца ня здольны вынесьці самоту Круглае залі. Аднак пагалоўнае нежаданьне пракаціцца на нясьвіскую кампрэсарную станцыю беларускага дзяржаўнага прадпрыемства па транспартыроўцы й пастаўцы газу «Белтрансгаз» выглядае загадкавым, асабліва калі ўзяць да ўвагі, што сьпярша на аўтаэкскурсыю запісалася вельмі шмат жадаючых. Пэўне, параскінуўшы мазгамі, асноўная маса дэпутатаў вырашыла правесьці гэты дзень больш плённа. Палатнікаў не спакусіла нават пэрспэктыва атрымаць фірменны трансгазаўскі парасон ці заехаць на зваротным шляху ў Мірскі замак. Ды што замак! Неафіцыйная лясная частка праграмы таксама не прываблiла дэпутатаў.

Падарожжа ладзіла кіраўніцтва «Белтрансгазу» на чале з намесьнікам гендырэктара Дзьмітрыем Анюком. Магчыма, менавіта адсутнасьць Пятра Пётуха стала вызначальнай для рашэньня тых дэпутатаў, якія наступным днём апраўдваліся сапсаванымі будзільнікамі. Між тым, Дзьмітрый Анюк апынуўся вельмі цікавым суразмоўцам і дасьведчанным адмыслоўцам. Ён здолеў адказаць на самыя закавырыстыя пытаньні цікаўных дэпутатаў, акрамя аднога: нашто ён патраціў свой час і грошы прадпрыемства на прыём палатніцкае дэлегацыі? Зрэшты, аб гэтым уголас ніхто запытацца не наважыўся.

Дэпутаты ўжо разгледзелі ў першым чытаньні законапраект аб трубаправодным транспарце ў РБ. Другое чытаньне дакумэнту заплянавана на сярэдзіну лістападу. Быццам знаёмства дэпутатаў з працоўнымі буднямі трансгазаўцаў выглядае натуральным. Да таго ж, Дзьмітры Анюк увесь час падкрэсьліваў важнасьць законапраекту, бо цяпер сфэра дзейнасьці «Белтрансгазу» рэгулюецца толькі адным нарматыўна-прававым актам. Гэтага, па меркаваньні газавікоў, мала. Цяпер прадпрыемству цяжкавата мець нармальныя стасункі зь мясцовай уладай. Немагчыма, напрыклад, забараніць людзям будаваць жыльлё блізка ад зарытых у зямлю трубаў. Упартых пасялянаў нічаму не навучыла здарэньне 1992 году, калі ўзьнік пажар з-за таго, што разышлося блізу 40 мэтраў газапроваду. У хаткі, што месьцілася на адлегласьці ў 700 мэтраў ад месца надзвычайнага здарэньня, з даху пацяклі рубэроідныя ручаіны.

Засмучае белтрансгазаўцаў і схільнасьць мясцовага насельніцтва да нажывы з азначальных слупочкаў, што ўсталяваныя на адлегласьці простае бачнасьці цягам усіх газаправодных нітак. Яркія балванкі вабяць мінакоў, як дзяцей цацкі. Іх увесь час выкопваюць ці проста сьпілоўваюць. Далейшы лёс паласатых слупочкаў невядомы.

Іншых праблемаў, быццам, у прадпрыемства няма, а калі й ёсьць, не дэпутацкая гэта справа займацца іх вырашэньнем. Гэта перадусім цяжкасьці разьлікаў ды ўзаемазалікаў. Акрамя ўсіх трубаправодаў, пракладзеных яшчэ да 1989 года, «Белтрансгаз» валодае двухсотдзевяцікіляметровым участкам газапроваду «Ямал – Эўропа». Калі пачне дзейнічаць другая яго нітка, штогод праз яго будзе пракачвацца блізу сотні мільярдаў кубамэтраў газу. Больш як палова накіруваецца ў бок Польшчы. Астатні расійскі газ пойдзе на спажываньне беларусам, так ня трапіўшы ў экспартную трубу.

Асноўнымі партнэрамі «Белтрансгазу» зьяўляюцца расійскія «Газпрам» ды «Ітэра», прычым пастаўкі апошняе ў агульным аб'ёме займаюць блізу траціны. Ад «Газпраму» Беларусь штогод атрымлівае паліва на 330 мільёнаў *BYB*. Толькі 28 мільёнаў даляраў зь іх спадар Мілер атрымлівае жывымі грашыма. Астатняе запісваецца ў крэдытэрскую запазычанасьць, якая пацiху касуецца, калі «Газпрам» пагодзіцца прыняць ад «Белтрансгазу» некалькі дзясяткаў трактараў ці камбайнаў, атрыманых замест нават не сапраўдных грошай, а беларускіх разьліковых білетаў ад айчынных вытворцаў тэхнікі. Прамыславікі ня здольныя аплаціць энэргію на вытворчасьць сваіх машын, якія пасьля гадамі чакаюць свайго часу ў заводзкіх парках.

Беларусь, у прыклад Украіне, вельмі рэдка спажывае газу больш, чым дазволена. Але такія выпадкі не выключаюцца цалкам. Што ж рабіць, калі 90 адсоткаў беларускае энэргетыкі трымаецца на газе? У разьвітых краінах такія паказальнікі лічацца недапушчальнымі. Адзін від паліва мусіць забясьпечваць ня больш за 30 адсоткаў ад прамысловасьці. Таму для нашае краіны пытаньне аб альтэрнатыўных крыніцах паліва вельмі актуальнае. Вось дзе спатрэбіўся б палатніцкі спрыт. Традыцыя выкарыстаньня газу цягнецца яшчэ з савецкіх часоў, калі гэтае паліва было адзіным, якое не вымагала тэрміновае аплаты. З палівам, якое можна падлічыць цыстэрнамі ці вагонамі, прасьцей. Плоціш – спажываеш, ня плоціш – нічога не атрымліваеш. Сыстэма транспартыроўкі газу пабудаваная такім чынам, што калі перакрываецца вентэль на газаадводзе неплацельшчыка, паліва не трапляе і да тых, хто плоціць за яго больш-менш сумленна. Безь цяпла рызыкуюць застацца сацыяльныя ўстановы пры прадпрыемствах, а гэтага дзяржава й «Белтрансгаз» як дзяржаўнае прадпрыемства дапусьціць аніяк ня могуць.

Улетку на забесьпячэньне патрэбаў усяе Беларусі дастакова 30-х мільёнаў кубамэтраў газу ў дзень. З надыходам халадоў спажываньне павялічваецца ўдвая. Калі б у трубе было, энэргетыкі ўзялі б і ўсе 70 мільёнаў кубамэтраў. Прагноз надвор'я, які паведамляе аб паніжэньні тэмпэратуры на два градусы, трансгазаўцы ўспрымаюць як неабходнасьць патраціць дадатковы мільён кубамэтраў. Цяпер на беларуска-расейскай мяжы адзін м³ газпрамаўскага прадукту каштуе 30 *USD*. Па такім кошце беларускія энэргетыкі ня супраць спажываць больш, аднак «Газпрам» ставіць іх на месца, згадваючы Літву. Прыбалты атрымліваюць газ па 79 *USD* за кубамэтар і плацяць ледзь ня загадзя. Беларускім недысцыплінаваным плацельшчыкам абяцаюць неўзабаве павялічыць не аб'ёмы паставак, а кошты на газ.

«Белтрансгаз» мае з кожнга мілераўскага кубамэтру 11,4 *USD*. Аднак гэтых грошай не стае, каб разьлічвацца з расіянамі своечасова й наагул. Толькі ў гэтым годзе запазычанасьць павялічылася на 100 мільёнаў *USD*. Акрамя таго, трэба знайсьці 40 мільёнаў на аплату газу, спажытага яшчэ ў 1999 годзе. Незвычайна, аднак добра скончыўся 2000-ы год. За гэты час часткова была пагашаная запазычанасьць 1999-га году й амаль не цалкам аплочаныя бягучыя пастаўкі. Зь «Ітэрай» у беларусаў стасункі складаюцца таксама някепска. Запазычанасьць гэтай кампаніі пакуль не перавышае 5-х мільёнаў *USD*.

Лішніх грошай «Белтрансгаз» ня мае. Усе, ад шарагоўцаў да спадара Анюка, сьведчаць, што эканамічныя ўмовы, у якіх даводзіцца функцыянаваць трубаправоднаму транспарту, не спрыяюць яго ўзбагачэньню. Заробкі пакідаюць жадаць лепшага, назіраюцца нацемкі на іх затрымку. Гэта раней усе, хто меў дачыненьне да паліва, каталіся, як сыр у масле. Цяпер у энэргетыкаў справы таксама някепскія, толькі ня ў нашай краіне. Калі б дэпутаты былі здольныя, іх бы папрасілі палепшыць сытуацыю менавіта тут. Даць «Белтрансгазу», скажам, больш самастойнасьці ў коштавай палітыцы й правілах разьлікаў. Аднак новы закон будзе найхутчэй кранацца забесьпячэньня экалягічнае бясьпекі вакол газаправодаў.

Калі дэпутаты вярталіся ў Менск, ім, як і па дарозе да нясьвіскае кампрэсарнае станцыі, круцілі кіно пра гераізм трансгзаўцаў. Нагадвалі, зноў нагадвалі аб важнасьці законапраекту, не дэталізуючы, праўда, мяркуемага зьместу. Сэнс вандроўкі так і застаўся невысьветленым. Не для таго ж палатнікі падарожнічалі, каб даведацца пра ціск ці дыямэтр трубы. ■

ПРОБЛЕМА

КУРОПАТЫ: без боли и памяти

АЛЕКСЕЙ КОРОЛЬ

Конфликт между властью и общественность вокруг Куропат продолжается, хотя внешне все пока выглядит спокойно. Бульдозеры отошли на исходные рубежи. Археологи завершили дополнительные исследования в придорожной зоне, не обнаружив новых захоронений. В лагере защитников мемориального комплекса парни и девушки из Молодого фронта читают книжки.

Но, похоже, это только временное затишье, что воочию и обнаружила очередная встреча представителей гражданской инициативы «За спасение Куропат» с директором «Автодора» А. Н. Лытиным. В отличие от прежних, проходивших за круглым столом, эта встреча состоялась непосредственно в Куропатах, так сказать на местности. Представители гражданской инициативы «За спасение Куропат» хотели узнать, что конкретно готовы сделать власти и непосредственный подрядчик строительных работ на минской кольцевой трассе – предприятие «Автодор» – для сохранения памятного места жертв массовых репрессий сталинского режима.

Услышали они прежние обещания найти средства (в рамках выделенных на расширение кольцевой трассы) для дополнительного благоустройства территории мемориала, узнали, что предусмотрено строительство стоянок для машин и двух подземных переходов. Но так и не услышали ничего внятного о возведении ограды вокруг куропатского некрополя, мерах по его сохранению, равно как и о финансировании этих работ.

Было понятно, что возможности «Автодора» и, главное, пределы его компетенции весьма ограничены: сугубо в рамках проекта по расширению кольцевой автодороги. Была видна и искренность А. Лытина вести работы с минимальным ущербом для мемориала. Но стала еще очевидней, опасность очередного обмана. Похоже, «Автодор» и его директор просто используются политическим руководством страны, что бы снять напряженность, добившись согласия общественности на расширение дороги, на деле пальцем не пошевелив для сохранения мемориала.

Сама же общественность мечется между двумя подходами. Первый, компромиссный. Он исходит из определения главной задачи: во что бы то ни стало уберечь национальный некрополь Куропаты от уничтожения. То есть, в случае если исследования археологов подтвердят отсутствие в пределах полосы расширения автодороги захоронений, взять строительство под жесткий контроль, не позволив и на пядь выйти за отведенные проектом границы. Это подход гражданской инициативы «За спасение Куропат». Мотивция: власти не отступятся от строительства дороги, силой отбросят защитников, и тогда урочище будет полностью уничтожено.

Второй, максималистский. Его сторонники, «Молодой фронт» и КХП, требуют отказаться от скороспелого проекта 2000 года по расширению нынешней трасы и вернуться к проекту 1993 года по строительству обходной автомагистрали, не проходящей по урочищу Куропаты.

Мотивация: за все годы, с тех пор как открылась страшная правда о сталинском терроре и о Куропатах, власти Беларуси ни одним жестом не дали знать о своем стремлении сохранить и увековечить память о безвинных жертвах массовых репрессий 30-40-х годов и тем более создать мемориал. Скорее, наоборот. Все до единого шествия в Куропаты воспринимались как враждебные, а их участники нередко подвергались преследованиям. Власти обманут в очередной раз.

На встрече в Куропатах заявила о своей позиции и еще одна сторона – жители микрорайона, чьи дома вплотную примыкают к кольцевой дороге, которая в случае расширения окажется буквально под их окнами. Уже выкорчеваны деревья узкой защитной полосы, уже идет разметка под автостоянку. Жить на окраине и на скоростном шоссе – перспектива не из приятных.


Разумеется, жители микрорайона против расширения дороги, что и подтвердили сотнями подписей под соответствующей петицией. Очевидно так же, что ими движет прежде всего их личный житейский интерес, а не забота о сохранении Куропат, к проблеме которых еще вчера большинство из них было равнодушно. Увы, это тоже печальное наследие эпохи тоталитаризма. Сегодня жильцы придорожной столичной окраины на собственном горьком опыте осознают связь между отношением к мертвым и отношением к живым.

Плохо, страшно, что амнезией памяти в сочетании с полным бездушием и равнодушием к проблемам и бедам своих сограждан страдает власть. Вся система авторитарного режима Лукашенко и каждый ее представитель в отдельности. Страдает неизлечимо.

Но это совпадение социальных требований жителей с идеальными требованиями демократов, которое так неожиданно высветили Куропаты, есть знак и для оппозиции. Спуститься с горних высей, сместить акценты, поставить социальные интересы людей во главу угла, мгновенно реагировать на локальные болевые импульсы, работать на расстоянии вытянутой руки, по конкретным маленьким на первый взгляд проблемам. Тогда, рано или поздно, люди отзовутся и на проблемы большие. Смещение акцентов на социальную мотивацию пересмотра проекта расширения кольцевой кроме увеличения шансов на выигрыш борьбы за Куропаты, может поспособствовать жителям других придорожных районов решить схожие проблемы себе на пользу.

С кольцевой дороги по иному увиделась и еще одна масштабная идея, вновь замаячившая на политическом горизонте: еще одной попытки диалога оппозиции с властью. Как, о чем и во имя чего начинать этот диалог, если власть по вопросу сохранения Куропат не подала даже слабого намека о готовности его решить. Может быть, есть смысл начать разговор о политическом диалоге с постановки вопроса о решении куропатской проблемы? ■

НОВОСТИ СНГ



Украина. МИД наших славянских братьев озабочен и требует от России надлежащей оценки атаки хулиганов на украинский культурный центр в Москве. Дело было так. В ночь на 21 октября двое неизвестных злоумышленников бросили к подъезду культурного центра две бутылки с зажигательной смесью. Охранникам удалось погасить огонь. Хулиганы сбежали, оставив следы – антиукраинские листовки. Как следует из листовок, данная акция стала местью за сбитый украинскими военными пассажирский самолет ТУ-154, следовавший рейсом Тель-Авив – Новосибирск. Листовки также содержали резкие выпады в адрес политического руководства Украины. Московские трясогузки подписались не известной до сих пор организацией «Начальная боевая подготовка». Наблюдатели отмечают, что аббревиатура этой организации (НБП) совпадает с аббревиатурой Национал-большевистской партии, чей вождь Эдуард Лимонов отбывает срок в тюрьме по обвинению в незаконном хранении оружия и боеприпасов.

Узбекистан. Узбекское правительство впервые заявило, что откроет свои границы для доставки гуманитарной помощи ООН в северный Афганистан. Из Ташкента в Термез уже отправилась колонна из 40 грузовиков с гуманитарным грузом для афганцев. Пресс-секретарь министерства иностранных дел Узбекистана Баходил Умаров сказал, что правительство пропустит колонну по единственному мосту через Амударью. Гуманитарную помощь получат афганцы, которые покинули свои дома после начала войны между «Талибаном» и Северным альянсом. Груз – медикаменты, зимняя одежда, одеяла, вода, витаминизированное молоко для голодающих детей – окажется весьма кстати для 360 тысяч беженцев, скопившихся на территории, подконтрольной Северному альянсу.



Таджикистан. В Душанбе состоялась трехсторонняя встреча Путина, Рахмонова и президента Афганистана в изгнании Бурхануддина Раббани. На повестке дня вопрос – кто будет править страной после вправления мозгов талибам. Имеется несколько сценариев будущего устройства Афганистана. Москва делает ставку на силы, которые группируются вокруг Раббани, и ищет поддержки как внутри Афганистана, так и за его пределами. США (линия Пауэлла) склоняются к мысли, подсказанной Пакистаном, об интегрировании в состав будущего коалиционного правительства умеренных талибов, которые выражают интересы пуштунского большинства. Путин торопился и прибыл в Душанбе прямиком с саммита АТЭС в Шанхае. Накануне саммита президент Таджикистана сообщил, что держит Путина постоянно в курсе происходящего: *«Мы разговариваем по телефону через день-два, иногда едва ли не каждый час, в зависимости от ситуации»*,– сказал Рахмонов. Афганцам просто повезло на внимание соседей и международного сообщества. Раньше всем было попросту наплевать на их беды.

Казахстан. Группа депутатов нижней палаты парламента Казахстана требует изменения системы выборности местных исполнительных органов. На заседании мажилиса (нижней палаты парламента Казахстана) группа депутатов во главе с Толеном Тохтасыновым обратилась к президенту страны Нурсултану Назарбаеву с требованием незамедлительно изменить систему выборности глав местных исполнительных органов. По мнению политических наблюдателей, пожелавших остаться неизвестными, такое требование фактически является открытым вызовом президенту и направлено на изменение конституционного строя республики. Ранее политические наблюдатели отмечали рост сепаратистских настроений среди некоторых региональных элит Казахстана. Если оппонентам президента Н. Назарбаева удастся реализовать идею об изменении системы выборности глав местных администраций, влияние центральной власти на регионы значительно уменьшится. Пока не известно, чем закончится бунт на корабле, и как отреагирует на требования депутатов Назарбаев.

Россия. Грустная новость. Во вторник скончался Георгий Вицин. В последнее время популярный актер серьезно болел. Ранее его госпитализировали после обострения хронических заболеваний сердца и печени. Георгий Вицин родился в 1918 году. Играл в Московском театре им. Ермоловой, с 1969 года – в театре-студии киноактера. Зрителям он, прежде всего, запомнился как комедийный актер. Трио Вицина, Никулина и Моргунова знала и любила вся страна. Вицин, в частности, снялся в фильмах: «Запасной игрок», «Двенадцатая ночь», «Операция «Ы» и другие приключения Шурика», «Кавказская пленница», «Женитьба Бальзаминова», «Джентльмены удачи» и других. В 1990 году ему присуждено звание народного артиста СССР.

НА СУШЕ И НА МОРЕ

ПРОВЕРКА ЦЕЛЕУКАЗАНИЯ

АЛЕКСАНДР СДВИЖКОВ

Раскинулось море широко. И волны бушуют вдали на местах гибели подводной лодки «Курск» и авиалайнера Ту-154. Слепая судьба ударила точно в цель. Но заряды лжи, обрушившиеся на оба несчастных случая, точностью попадания отнюдь не отличались. Поэтому заинтересованному наблюдателю не составляет большого труда отделить правду от вымысла, исходившего из уст официальных и полуофициальных, и совсем неофициальных.

Рано или поздно все тайное становится явным. Мелкие технические подробности катастрофы «Курска» и Ту-154 авиакомпании «Сибирь» достались в удел узким специалистам. Для всех остальных хватает осознания элементарных фактов, что подводная лодка подорвалась на собственной российской торпеде, а самолет был сбит украинской зенитной ракетой.

Пусть «Курск» поднят на поверхность, а Ту-154 будет вечно покоиться на дне морском. Но в обоих случаях начальствующим лицам не удалось скрыть истину. Хотя и в августе 2000, и в октябре 2001 генералы вкупе с адмиралами вывалили горы вранья, чтобы запудрить мозги политическому руководству и народам своих стран.

Самую мощную спецпропагандистскую кампанию проводили российские военморы-начальники. Несколько месяцев они упорно настаивали на нелепой версии столкновения «Курска» с некоей иностранной подводной лодкой.

Примерно по такой методике в училищах и академиях их учили обрабатывать солдат противника и население оккупированных территорий. Но то, что едва получалось в пору второй мировой войны, абсолютно не прошло в информационно-технологические времена.

Достаточно быстро по всему миру распространились технологические подробности безусловной гибели всех моряков-подводников несчастного «Курска». Подводная лодка не вышла на связь в субботу 12 августа. В воскресенье ее обнаружили на дне морском. Когда «Курск» уже лежал на глубине 110 метров, на поверхность стала просачиваться правда о случившейся трагедии.

Жена командира «Курска» капитана Лячина в воскресенье 13 уже знала о гибели мужа. По ее словам, на базе АПЛ в Видяево ни для кого не было секретом, что *«подводные лодки этого класса никогда на грунт не ложатся»*. Аналогично и другие жены подводников знали о том, что случилось самое страшное.

Взрыв первой торпеды и сдетонировавшего боезапаса «Курска» были зафиксированы сейсмологическими станциями. Более того, второй взрыв был настолько мощным, что все корабли, находившиеся в радиусе 40 миль, испытали на себе чувствительный гидродинамический удар. По причине чудовищного взрыва «Курск» так быстро отыскали в обширной акватории Баренцева моря. Искать тоже было кому.

Напомним, что в августе 2000 проводились учения российского Северного флота, крупнейшие за последние 10 лет. Адмиралам очень хотелось отрапортовать об успехах в *«боевой и политической подготовке»*. Из-за катастрофы «Курска» парадного рапорта не получилось, и пришлось лгать.

11 верасьня адкрыла новую эпоху ня толькі для авіякампаніяў, але й для ВПК па ўсім сьвеце. Зараз зьяўляюцца магчымасьці для новага ўздыму айчыннай навукі, бо попыт на фундамэнтальныя распрацоўкі вызначаецца рынкам ваенных тэхналёгіяў. Калі «халтуру» на замежжа цэнтралізаваць і паставіць на паток, пры правільным падыходзе можна атрымаць неслабую фінансавую аддачу.

Здаецца, пасьля 11 верасьня каманда Лукашэнкі зразумела гэта хутчэй, чым самі беларускія навукоўцы. Прызначэньне свайго «смотрящего» насуперак акадэмічным традыцыям можа азначаць вывядзеньне Акадэміі навук з паўразбуранага стану ў шэраг дзяржаўных прыярытэтаў. Хутчэй за ўсё, будзе ўзяты курс на поўнамаштабнае аднаўленьне ВПК у зьвязку з Расеяй.

А гэта значыць, што ў кантэксьце сусьветнага ваеннага абвастрэньня Лукашэнка нарэшце знайшоў яшчэ адну крыніцу фінансаваньня, якая дагэтуль была недагледжанай і неўпарадкаванай. Пры належным падыходзе беларуская Акадэмія навук можа ў адзін момант ператварыцца з затхлай канторы ў прыбытковае прадпрыемства.

Дзеля пасьпяховай працы трэба толькі ўкласьці ў галіну нейкія сродкі і паставіць над разумнікамі-інтэлігентамі добрага заўгаса. Спэцыялісты будуць працаваць, а заўгас – кантраляваць фінансы й супрацоўнікаў, назіраючы, каб яны не працавалі налева й не філонілі. І ўсё будзе *OK*. ■



КАМЭНТАР

Кухаркі й дзяржава

Прызначэньне Міхаіла Мясьніковіча прэзыдэнтам Нацыянальнай акадэміі навук выклікала рэзананс ня толькі ў Беларусі. Заўважыла такія кадравыя ракіроўкі й прэса расейская, напрыклад, «Время новостей».

Самымі скупымі на камэнтары аказаліся тыя, каго дэкрэт №25 пачуць непасрэдна – супрацоўнікі НАН. Усе спробы карэспандэнта «Згоды» пачуць меркаваньне сябраў прэзыдыюму Акадэміі навук наконт плянуемага рэфармаваньня іх установы былі беспасьпяховыя. Некаторыя сакратаркі адказвалі, што *«усе у шоку»*, а некаторыя проста казалі, што камэнтараў ня будзе. На пытаньне *«Чаму?»* адказвалі, што гэтага яны таксама сказаць ня могуць. Затое выказаць сваё меркаваньне пагадзіўся акадэмік **Радзім Гарэцкі**, які ў 1992–1997 гадох займаў пасаду віцэ-прэзыдэнта Акадэміі навук:

Прызначэньне Міхаіла Мясьніковіча прэзыдэнтам Нацыянальнай акадэміі навук – гэта парушэньне статуту АН. Статут Акадэміі навук прадугледжвае агульным сходам і зацьвярджаецца Саветам міністраў. Па-першае, прэзідэнт Акадэміі навук выбіраецца агульным сходам. Па-другое, прэзыдэнтам Акадэміі навук можа быць толькі паўнапраўны член Акадэміі навук, то бок акадэмік. Прызначэньне чыноўніка замест акадэміка – гэта працяг дыктарскага стылю кіраваньня. Адна вольная дэмакратычная арганізацыя заставалася з працэдурай выбараў, дык у ёй таксама трэба прызначаць, як і ўсюды прызначаюцца кіраўнікі. Зь цягам часу будуць і акадэмікаў прызначаць. Гэта натуральны працяг таго, што рабілася дагэтуль.

Чаму Акадэміяй навук не задаволены? Таму што лічаць, што займаецца фундамэнтальнымі дасьледваньнямі й не дае аддачы. Але ўжо даўно вядома, што самая лепшая прыкладная навука – гэта фундамэнтальная. Проста навука тая не «востребована», кажучы па-руску. У нас ёсьць тысячы вельмі добрых распрацовак, прычым вельмі канкрэтных, прыкладных. Але ніхто ня можа імі скарыстацца. І ня хоча. Таму што для гэтага трэба шукаць інвэстыцыі, грошы, а гэта вельмі цяжкая зрабіць. Таму справа не ў вучоных, не ў навуцы, не ў Акадэміі навук, а ў мэханізмах укараненьня распрацовак. Трэба прадумаць гэты этап. Для гэтага патрэбна адмысловае фінансаваньне. У нас і раней яго не было, а зараз дык зусім няма. Вось туды трэба накіроўваць усе магчымасьці нашых чыноўнікаў высокага рангу. Каго не саджай на чале Акадэміі, калі ня будзе такога мэханізму, ня будзе ніякай карысьці ад працы АН.

ПО ПОВОДУ

Государство БГУ

Окончание. Начало на стр. 1

победили последние. Реальное влияние университета, а точнее, его ректора показывает и недавний инцидент с «МакДональдсом». БГУ уже давно планирует строительство досугового центра на пятачке Привокзальной площади. Как раз там, где стоит здание американской закусочной. Строительство грозит «МакДональдсу» громадными убытками: кроме любителей картофеля фри, можно потерять и клиентов офисных помещений, которые и приносят основной доход. И в этот раз первой отступила не администрация университета, а менеджмент «МакДональдса» (можно только догадываться, на чем сошлись, и чего это стоило фаст-фуду).

Строительство вообще является коньком ректора. Выбив выделенную бюджетную линию, университет отремонтировал общежития №1, 6 и построил №10. Сейчас ведется реконструкция интерната №2. В 1999 открылся новое здание ректората (студенческое прозвище «Кремль» из-за красного цвета). К юбилею Лицей БГУ переехал в здание бывшего Дома учителя, закончился капитальный ремонт биофака, физфака и геофака.

Если по строительству и ремонту учебных корпусов вопросов мало, то по сложившейся практике различных празднований – сколько угодно. На новогодних ректорских банкетах помимо артистов белорусской эстрады выступали недешевые Филипп Киркоров, Валерий Меладзе и даже группа *Smokie* (правда, без Криса Нормана). На праздновании начала учебного 1999 года пела «НА-НА» (два раза глохла «фанера»). Насколько это уместно в то время, когда преподаватели десятилетиями живут в общежитиях, судите сами.

Конец лафы

Этот учебный год начался с невеселого известия: БГУ лишен всех льгот и привилегий. Паника началась, как только преподаватели и так не избалованные жалованьем получили зарплату за сентябрь: скажем, у кандидата наук вместе с авансом она составила долларов 60. Ректорат постарался всех успокоить: это недоразумение связано с тем, что вовремя не пройдена аттестация, а вовсе не с изменением статуса университета. Всем пообещали выплатить задолженность в октябрьский аванс, что, кстати, и выполнили.

Тем не менее, указом №516 БГУ действительно разжаловали в обыкновенный ВУЗ. А ректора опять подчинили Министерству образования. Объяснений тому несколько. Первое, но не главное, – это слабая поддержка президента студентами. Хуже всего проголосовали общежития в Щемыслицах (об этом «Згода» писала в №37). Второе, и основное, – ходят упорные слухи, что ректор Козулин собирался выдвигаться кандидатом в президенты. Якобы его даже собирался поддерживать Василий Леонов, а демократически настроенными сотрудниками университета была написана стратегия избирательной кампании. Потом, правда, Козулин одумался и даже отнес стратегию в администрацию президента. Но было уже поздно. Лукашенко такого не прощает.

Некоторое время Александру Козулину прочили должность министра образования. Но с этим ректора БГУ ждало коварное унижение: мало того, что должность занял Петр Бригадин, бывший глава Академии управления, а до этого бывший первый проректор БГУ, так и заместителем министра стал недавний проректор БГУ Александр Жук. Теперь Козулин будет подчиняться двум своим недавним подчиненным. Заслужит ли ректор прощение президента? По-прежнему больной вопрос. Вот такие грустные юбилеи. ■

АСОБА

СТРАЧАНЫЯ МРОІ БЕЛАРУСКАГА АДРАДЖЭННЯ

роздум філосафа Акудовіча

– Спадар Акудовіч, у вашым артыкуле нацыянальная эліта Адраджэння, якая заўсёды выступала як суб'ект аналізу ўсяго астатняга грамадства, упершыню і нарэшце зрабілася таксама і аб'ектам. На мой погляд, вялікую грамадзянскую смеласць трэба займець, каб адзначыць, што «нашае Адраджэнне сталася своеасаблівым інтэлектуальным генацыдам беларускага грамадства, бо яно адмаўляла ў праве на вартасную ацэнку свайго жыцця не толькі сучаснікам, але і дзесяткам папярэдніх пакаленняў, якія без супраціву 200 год пражылі пад ярмом усходняга каланізатара». Праўда, як вы дасціпна адзначылі, у адрозненне ад памерлых, сучаснікі яшчэ мелі шанец рэабілітавацца, у тым ліку ўступіць у БНФ і падпісацца на «Свабоду» ды «Нашу Ніву».

Вы ацанілі рух Адраджэння як шлях у ідэальнае нікуды, упрочкі ад рэальнага, тутэйшага народу, адзначылі, што «Адраджэнне адмовіла рэальнай Беларусі ў хоць якой вартасці, за патрабаваннямі вяртання гістарычнай спадчыны, мовы і культурнага досведу хавалася жорсткая ідэалагічная канструкцыя, у якую не ўпісваліся здабыткі і каштоўнасці беларускага грамадства, бо яны мелі альбо камуністычнае, альбо каланіяльнае паходжанне. А ў выніку, «згодна з выпрацаванай у падпольных галовах канцэпцыяй, права «чалавекам звацца» мелі адно героі барацьбы з каланізацыяй і ахвяры камуністычнага тэрору».

Пішучы пра «глыбока рэпрэсіўную сутнасць ідэі Адраджэння», вы здзіўляецеся, што яе «не заўважылі ні ейныя адэпты, ні апаненты – уся ўвага канцэнтравалася на той яе частцы, якая рэпрэсавала вынікі расейскай культурнай і палітычнай экспансіі». А ў выніку першай і галоўнай ахвярай адраджэнскіх рэпрэсіяў стаўся «беларускі народ» – аб'ект расійскай культурнай і палітычнай экспансіі».

Па сутнасці, калі не хаваць галаву ў пясок, мусім прызнаць, што канцэпцыя адраджэння як супраціву чужынцам і змагання за ідэальную Беларусь прывяла ў віртуальную прастору, паралельную рэальнасць, з якой трэба неяк шукаць выйсце ў сапраўдны свет.

– У эсэ «Без нас», вельмі ўмоўна падзяліўшы ўсё беларускае грамадства на нацыянальна заангажаваных «мы» (прыкладна 10%) і ўсіх астатніх (прыкладна 90%), я спыніўся толькі на адной праблеме суадносінаў унутры нашага грамадства, менавіта, на месцы нацыянальнага рушэння, распачатага ў другой палове 80-х гэтак званымі адраджэнцамі. Але хаця гэтая праблема толькі адна з многіх, яна мне бачыцца сярод дамінантных у фармаванні структуры Беларускай Дзяржавы, бо без яе пазітыўнага вырашэння мы назаўжды застанемся ў стане перманентнага канфлікту паміж проста грамадзянамі РБ і «сапраўднымі» беларусамі.

Між іншым, гісторыя гэтага канфлікту распачалася яшчэ ў XIX стагоддзі, калі ў еўрапейскім кантэксце паўставання нацыянальных дзяржаваў узнікла беларуская ідэя, якая прайшла звычайны шлях ад культурнай аўтаноміі да незалежнай нацыянальнай дзяржавы. Аднак у выпадку з Беларуссю эвалюцыя ідэі не была падмацаваная адпаведнай эвалюцыяй культурнай і сацыяльна-палітычнай рэальнасці. Уласна беларускае, уласна беларушчына не зрабіліся дамінуючымі фактарамі нават у сітуацыі набыцця дзяржаўнага суверэнітэту. Адэпты нацыянальнай дзяржавы вінавацяць у гэтым шматлікіх унутраных ды знадворкавых ворагаў беларушчыны і звязваюць свае спадзевы з перамогай (хоць калі) над усёй варажнечай. Гэта значыць, яны не бачаць (ці не хочуць бачыць) хоць якога іншага варыянту, акрамя безальтэрнатыўнага: альбо ўся Беларусь будзе беларускай, альбо яе не будзе як Беларусі.

Было б недарэчна адмаўляць тэзу аб шматлікіх непрыяцелях ідэі беларускай Беларусі, але ніводная нацыя не паўставала без пераадолення жорсткага ўнутранага і вонкавага супраціву. Таму, калі цягам стагоддзя з гакам у самых розных і спрыяльных гістарычных варунках мы не здолелі ўцялесніць нацыянальную мрою, то некалі мусіла з'явіцца ўсведамленне, што мы мроім нешта не тое.

Дык вось у шэрагу сваіх апошніх тэкстаў ад «метафізічных» («Нідзе і Ніхто», «Разбурыць Парыж» – часопіс «Фрагменты») да публіцыстычных, кшталту вышэй згаданага эсэ «Без нас», я хачу давесці найперш нацыянальна заангажаванай публіцы, што ідэя татальна беларускай Беларусі – не жыццядайная ідэя. Больш за тое, калі мы жадаем зберагчы беларушчыну, хоць у якіх абсягах, то правінны як мага хутчэй адмовіцца ад гэтай утопіі.


– Баюся, гэта вельмі цяжка, бо змагары і ахвяры мінуўшчыны, здаецца, пытаюць нас: ці не адракліся вы, ці не здрадзілі, не забыліся...?

– Разумею, працэс адмаўлення ад ідэі, на ўцялесненне якой цягам апошняга стагоддзя ахвяравалі свае жыцці і сціжмы лепшыя людзі краіны, – трагічны працэс для кожнага, хто ідзе тым самым шляхам, і для мяне персанальна. Ды што зробіш, досвед усяго нашага прамінулага пераканаўча сведчыць, што прастора, сёння пазначаная дзяржаўнымі межамі РБ, можа быць больш-менш трывала паяднаная толькі ідэяй сацыяльнасці, але ні ў якім разе ідэяй нацыянальнасці. Не змог запанаваць тут ні беларускі, ні польскі, ні рускі нацыяналізм.

Пра апошні выдатна сказана ў артыкуле Юрыя Дракахруста «Сапега і Машэраў» («Свободные новости»): *«Разумнаму чалавеку, які верыць у тое, што Беларусь павінна быць Расіяй, што яна і ёсць Расія, самы час ўпасці ў роспач – калі нават у ідэальнай сітуацыі гэтая формула не стала рэчаіснасцю, то не стане ёю ніколі».*

Мне зусім не шкада беларускіх русафілаў (як, здагадваюся, таксама не шкада ім мяне), але далей я паспрабую хоць трохі суцешыць сябе і іх і самых розных іншых. Як мне ўяўляецца, то ўсім нам разам неўзабаве давядзецца забыць на свае рознавектарныя мроі і пагадзіцца, што іншай, акрамя як сацыяльнай, беларуская дзяржава і не можа быць. А пагадзіўшыся з гэтым, шукаць у прасторы сацыяльнага сваё месца кожнай нацыянальна-культурнай мадэлі: беларускай, рускай, польскай і г. д.

А калі мы ўсе адмовімся ад звабнай перспектывы татальнага дамінавання нейкай адной нацыянальнай, рэлігійнай, культурнай, ідэалагічнай ды іншых мадэляў і зразумеем сваё адзінства ў суплёце разнастайнасці, то, магчыма, спакваля зліквідуем напругу супрацьстаяння ўсіх з кожным і зможам скіраваць



ТАЦЦЯНА ПАЛЯКОВА

Імя Валянціна Акудовіча трапіла сярод прозвішчаў сусветна вядомых філосафаў у адзіную ў свеце (што прыемна, выдадзеную ў Беларусі) энцыклапедыю постмадэрнізму. Аднак шырокаму колу чытачоў Валянцін Акудовіч знаёмы перш за ўсё арыгінальнымі і вострымі артыкуламі ў прэсе. Апошні з іх — эсэ «Без нас», надрукаванае ў «Нашай Ніве», — выклікаў шэраг інтэрв'ю з аўтарам і цікавы аналітычны каментар Юрыя Дракахруста ў перадвыбарчым нумары «Свободных новостей». На думку Дракахруста, згаданы артыкул мае не менш істотнае значэнне для беларускага грамадства, чым самі прайшоўшыя выбары.

сваю энергетыку не на бясплённы супраціў, а на разгортванне і замацаванне таго, што кожнаму з нас уяўляецца каштоўным.

Мяркую, што і беларускасць, лакалізаваная ў межах патэнцыялу сваіх рэальных магчымасцяў, толькі выйграе ў параўнанні з цяперашняй сітуацыяй, калі, не маючы на тое моцы, яна намагалася ахапіць сваёй патэнцыйнасцю ўвесь дыскурс Беларусі і з гэтага ўсюды распускаецца ў нішто.

– Здаецца, калі мы разважаем аб сённяшнім стане краіны, нельга абмінуць тэзу аб яе татальнай саветызаванасці. На жаль, яна ўласціва не толькі «быдлянскаму народу», але і самым розным элітам, у тым ліку апазіцыйнай. Бяру смеласць інтэрпрэтаваць змаганне апазіцыі з Лукашэнкам як змаганне ранняга агрэсіўнага саветызму, што ўчапіўся ў краіну зубамі, як у добры кавалак сала (паспрабуй адымі!), з познім саветызмам, якому ў значнай ступені ўласціва імітатарства. Імітацыя ідэйнасці, партыйнасці, змагання з ворагамі... Можа, таму і пераважная частка эліты не падтрымала адкрыта апазіцыю на нядаўніх выбарах. Не шмат жадаючых скокнуць у намаляваную лодку!

– Не ведаю, што да ўпраўленчай і тэхнічнай элітаў, але мастацкая эліта ў абсалютнай сваёй большасці актыўна падтрымала апазіцыю, прынамсі – нацыянальная. Сустрэчы на Кастрычніцкай плошчы 9-га і 10-га верасня нагадвалі не столькі паслявыбарчы мітынг, колькі форум творчых работнікаў. Іншая рэч, ці варта мастацкім элітам з нейкай дурнотнай зацятасцю падтрымліваць апазіцыю толькі за тое, што яна апазіцыя?

Бо сёння і ва ўладзе, і ў апазіцыі вядуць рэй хлопцы з адной і той самай партшколы, якія, зусім верагодна, сядзелі за адной партай, а цяпер падзялілі паміж сабою ўладныя сферы: адныя кіруюць дзяржаўнымі структурамі, другія - апазіцыйнымі. Адсюль і вельмі трапна ўжытае вамі слова «імітатарства» адносна палітычнай барацьбы, прычым, дадам ад сябе, «імітатарства» як з таго, так і з другога боку (пакінем за кантэкстам гаворкі цьмяную сітуацыю са знікненнем вядомых палітыкаў).

А за што ім змагацца ўсур'ез? Ідэалогія ў іх адна і тая самая, улада над апазіцыйнымі структурамі не менш прыбытковая ва ўсіх сэнсах, чым улада ў структурах дзяржаўных, да таго ж кожны «дзяржаўны» палітык ведае, што рана ці позна яму давядзецца шукаць сабе месца альбо ў прыватным бізнесе, альбо сярод апазіцыйных палітыкаў. Ды з чаго гэта ўсур'ёз будзе змагацца апазіцыйны палітык з палітыкам ад улады, калі пры ўладзе і ягоны сват, і брат, і вучань, і настаўнік? Таму імітуюць і тыя, і другія барацьбу адных з другімі за шчаслівую Беларусь, бо калі не будзе гэтай барацьбы, то колькасць месцаў пад палітычным сонцам зменшыцца роўна ўдвая.

Але я не хацеў бы, каб мой скепсіс да нашай апазіцыі (хто сёння толькі не здзекуецца з яе?) таясаміўся з непрыняццем апазіцыі як такой. Як раз наадварот. Самая вялікая каштоўнасць апазіцыі – у феномене яе наяўнасці. Без апазіцыі як неадменнага інстытута дэмакратыі немагчыма пабудаваць грамадзянскую супольнасць. Аднак беларускае грамадства, як чорт ладана, усё яшчэ баіцца нават самога слова «апазіцыянер». І пакуль гэтая сітуацыя не пераменіцца – не пераменіцца нічога. А змяніцца яна зможа толькі ў працэсе прывыкання да наяўнасці апазіцыі, якой бы тая ні была сама з сябе.

– Хацелася б пачуць пра яшчэ адзін феномен: прыкладна палова насельніцтва ўсё ж прагаласавала за Лукашэнку. Чаму?

– Мне ўжо даводзілася казаць, што калі на першых выбарах за Лукашэнку галасавалі як за альтэрнатыву Кебічу, а не як уласна за Лукашэнку, то на гэты раз большасць ягоных выбаршчыкаў аддалі яму свае галасы свядома, галасавалі за яго як за прэзідэнта, які іх цалкам ці ў дастатковай меры задавальняе.

– Як можна быць задаволеным перманентным збядненнем?

– Задаволеным, як і незадаволеным кіраўніком дзяржавы можна быць з сотні самых розных прычынаў. Ад чыста эмацыйнай сімпатыі да глыбока аналітычнага разліку, што ў гэткай сітуацыі дрэннае не ёсць яшчэ самым горшым.

Колькі яшчэ часу патрэбна апазіцыйным палітыкам, каб зразумець, што безграшоў'е механізатара, настаўніка, навукоўца альбо падаткавы цяжар дробнага і сярэдняга бізнесоўца – гэта яшчэ не абавязковая падстава, каб яны галасавалі за змену ўлады. Бо ў кампенсацыю безграшоў'я ці звышпадаткаў улада можа прапанаваць нешта нематэрыяльнае, але з гэтага не менш істотнае для існавання чалавека: зразумелыя матывацыі яе паводзінаў, хай сабе і мінімальную, але сацыяльную абароненасць, пераемнасць і з гэтага стабільнасць стратэгічных мадэляў, ад ідэалагічных да эканамічных, псіхалагічную ўтульнасць і г. д. і да т. п.

Аднак асноўная прычына досыць стабільнай папулярнасці Лукашэнкі не столькі ў нейкіх прывідна-містычных фактарах, колькі ў рэчах для большасці насельніцтва зусім відавочных і цалкам матэрыяльных. Каб патлумачыць апошняе, найперш адзначым, што апазіцыя і астатняя, гэта значыць пераважная частка грамадства жывуць хоць і ў адной прасторы, але ў дзвюх зусім розных дзяржавах. Для апазіцыі Беларусь – жабрацкая краіна з разваленай эканомікай, нішчымным заробкам, таталітарным ладам, адсутнасцю законнасці, эканамічным уціскам, палітычным гвалтам, быдлянскім народам, нацыянальным нігілізмам, засаветызаванай ідэалогіяй і так да бясконцасці. І вінаваты ва ўсім гэтым жаху не хто іншы, як спадар Лукашэнка.

А вось для неапазіцыйнай і пакуль пераважнай часткі грамадства Беларусь хаця можа і не выглядае на нейкі рай, напэўна, бачыцца досыць прыстойнай краінай. Прынамсі, у параўнанні з краінамі-суседкамі. Тут вам ні бандытызму, ні вайны, стабільныя заробкі і рэгулярныя пенсіі, добрыя дарогі і «Славянскі базар», публічнае шанаванне простага люду і ўвага да спорту, новая кальцавая дарога вакол Мінска, штогадовыя вясковыя «дажынкі», не абы-якія вайсковыя парады, адзін з буйнейшых ва Усходняй Еўропе чыгуначны вакзал, а галоўнае, сам прэзідэнт, які можа паслаць як мага далей хоць Вашынгтон, хоць Маскву.

Дзіўная атрымалася рэч. Апазіцыя, каб перамагчы Лукашэнку, не змагла прыдумаць нічога лепшага, як ва ўсіх падуладных ёй СМІ з дня ў дзень ганьбіць і ганьбіць не толькі яго самога, але і ўсю краіну, увесь народ, тым самым спадзяючыся, што чым больш жахлівым будзе выглядаць той свет, у якім мы жывем, і тыя людзі, сярод якіх мы жывем, тым хутчэй народ паўстане супраць таго, хто ўжахлівіў нашае жыццё.

Але апазіцыя не ўлічыла, што чалавек, калі ён не паталагічны мазахіст, выбярэ для сябе (пры наяўнасці выбару) не краіну жахаў, рэпрэсіяў, занядбаласці, а краіну поспехаў, перамогаў, песняў. Мы яшчэ будзем удзячныя беларускаму грамадству за ягоны выбар, мы яшчэ будзем удзячныя яму за тое, што яно не чытае нашых газет, не ходзіць на нашыя мітынгі і не галасуе за нашых кандыдатаў. Бо гэта азначае, што, дзякаваць Богу, мы сваім вярбальным брудам забрудзілі не ўсю краіну, а толькі свае ўласныя глузды і душы.

Скажу і больш, калі апазіцыя не выверне сваю стратэгію татальнага шальмавання ўсіх і ўсяго на шляхі павагі да ўсіх сваіх сучаснікаў і гонару за тую рэальную Беларусь, якая яна ёсць сёння, то ў самым недалёкім будучым яна апынецца па самыя вушы ў тым гаўне, якое плённа прадукавала ўсе гэтыя сем гадоў.

– Між тым, напярэдадні выбараў так хацелася спадзявацца на нейкі цуд...

– Шчыра кажучы, эмацыйна я гэтаксама ўсё ж такі чакаў цуду. Але варта ўжо шчыра прызнаць, перамога над Лукашэнкам стане магчымай тады, калі ў грамадстве выспее рэальная патрэба дэмакратычных інстытуцый. Негледзячы на ўсе нашыя спадзяванні, цалкам верагодна, што і праз пяць гадоў на прэзідэнцкіх выбарах пераможа не прадстаўнік апазіцыі, а якая-небудзь наменклатурная фігура, здольная забяспечыць Лукашэнку гарантыі бяспекі і пераемнасць улады, як гэта адбылося пры выбранні Пуціна ў Расеі.

Аднак вышэйсказанае не значыць, што дэмакратычная апазіцыя павінна апусціць рукі і сысці з грамадскай арэны. Наадварот, менавіта сёння перад ёю стаіць самая істотная задача – шырока разгарнуць шэраговую, не надта эфектную, але найбольш эфектыўную штодзённую, чорную працу, каб дзень за днём даводзіць і даводзіць ідэалы і прынцыпы дэмакратыі да кожнага жыхара краіны.

■

КОНТАРКУЛЬТУРА

ЗРАБІ СВАЮ КУЛЬТУРУ САМ!

МІКОЛА РЭЧЫЦКІ

Стандартная карма беларускага рокера — сядзець на рэпэтыцыйнай кропцы й скардзіцца на адсутнасьць у краіне буйных лейблаў, грошаў і шоу-бізнэсу. Але ёсьць і іншыя людзі — тыя, для каго галоўнае ня посьпех і стадыёны фанатак, а тое, каб іх чулі.

Імёны гэтых музыкаў ніколі ня зьявяцца на афішах БМА або «Линии Звука», а на іхных касэтах ніколі ня будзе знаку капірайту. Але менавіта іхныя запісы часьцяком разыходзяцца па народзе ў значна шырэйшых межах, чым прадукцыя простага клюбнага гурта. Рэцэнзыі на іхныя пятнаццаціхвілінныя альбомы часьцяком можна прачытаць у самых нечаканых месцах – ад якіх-небудзь краснадарскіх да французкіх незалежных часопісаў. У сваёй творчасьці яны кіруюцца прынцыпам *DIY*. Прынцыпам антыкамэрцыйнасьці, аўтаномнасьці ды самастойнасьці.

Абрэвіятура *DIY (do it yourself)* пачала устойліва спалучацца з панк-хардкор культурай у семідзесятыя гады. Сутыкненьне ідэй бескампраміснай творчасьці з законамі шоу-бізнэсу мусіла знайсьці сваё выйсьце. Менавіта тады, каб ня быць абмежаванымі ў праве даносіць да слухача тое, што сапраўды турбуе, а ня тое, што падабаецца мэнэджэру, творцы пачалі вырабляць прадукцыю за свае грошы й распаўсюджваць уласнымі сіламі.

Безумоўна,ісьці на такі крок можна толькі, калі табе ў прынцыпе ёсьць што распаўсюджваць, і твае ідэі сапраўды вартыя таго, каб за іх паўпірацца. *DIY* прадукцыя звычайна распаўсюджваецца па сабекошце. Галоўная мэта тут – не нажыцца, а данесьці сваю творчасьць да тых, каму гэта цікава.

Субкультура ўключае ў сябе ня толькі музыку, але й самвыдавецкія часопісы – г. зв.»зіны». У прынцыпе, гэта бакі аднаго мэдалю. Чалавек, незадаволены навакольным сьветам, выкарыстоўвае любыя сродкі, для таго каб разносіць уласныя ідэі – антыспажывецкасьці, антыфашызму, экалягізму. Зразумела, што калі ідэяў няма, то й распаўсюджваць няма чаго. Вось тады застаецца толькі сядзець і ныць аб гаротным беларускім шоу-бізнэсе.

DIY зьяўляецца абсалютна непадцэнзурнай крыніцай інфармацыі. І таннасьць ва ўрон якасьці – сродак, каб распаўсюдзіць яе ў як мага шырэйшым асяроддзі. Звычайна на прадукт ня ставіцца капірайтаў, бо ідэалёгія *DIY* мае на ўвазе магчымасьць бескантрольнага капіяваньня й тыражаваньня. Адзіная ўмова сумленнага *DIY* – калі прадукт дастаўся па нізкім кошце, то й распаўсюджваць яго трэба, ня робячы на ім бізнэс.

Калі не лічыць першых напаўпрафэсыйных спробаў 94-96 года, то першыя беларускія *DIY* часопісы ўзьніклі ў 1999 годзе. Гэта былі гарадзенскі «КЕНГУРУ» і зін *Don't panic!*, які выдаваў заснавальнік гурта *HATE TO STATE* Ігар Конік. За наступны год колькасьць самвыдату пашырылася й зараз складае блізу двух дзясяткаў найменьняў. Сярод іх палітычныя, экалягічныя, музычныя выданьні – «Правакатар», «Разам!», «Ребро жёсткости», *Lefthunder*. Выдаюцца часопісы найпрасьцейшым шляхам. Звычайна гэта кампутаровая вёрстка, памножаная на рызографе або ксэраксе. Касэты гуртоў звычайна пішуцца не на прафэсыйных студыях, а на рэпэтыцыйных кропках.

Але ў апошнім выпадку трэба адрозьніваць *DIY* музыкаў ад чатырнаццацігадовых падлеткаў. Калі апошнія ня могуць запісацца на студыі, бо ня маюць нармалёвага матар'ялу, аўдыторыі й грошай, то *DIY*-музыкі звычайна валодаюць нядрэнным узроўнем. Ня пішуцца на студыях яны зь іньшых прычынаў – прынцыповага жаданьня зрабіць сабекошт прадукту максымальна ніжэйшым. Маецца на ўвазе, што калі ў каманды сур'ёзны падыход да сваёй творчасьці, то яна жадае данесьці да слухача шмат рэчаў больш важных, чым якасьць запісу.

На Беларусі шмат сур'ёзных рок-гуртоў, якія складаюць *DIY* сцэну. Найбольш вядомы сярод іх гарадзенскі *DEVIATION*. Свой сьвежы альбом *Guerilla Urbana* яны зьбіраюцца распаўсюджваць менавіта па сетцы *DIY*. І разьлічваюць на посьпех ня меншы, чым папярэдняга альбому *«Х... вам! Або таталітарызм ня пройдзе»*, выдадзенага лэйблам БМА. Супрацоўніцтва з Супрановічам каманда лічыць памылкай.

Праўда, апошнім часам *DIY* каманды рэдка пабачыш у клюбах, бо адміністрацыя ўсё часьцей бярэ на сабе функцыі цэнзуры. Сацыяльная, палітычная лірыка ім не падабаецца, бо галоўная задача клюбу – *«каб людзі прыходзілі адпачываць»*. Арыгінальнае выйсьце было знойдзенае ў Гародні. Менавіта там да апошняга часу дзейнічаў нелегальны *SHIT SOUND CLUB*. У памяшканьні звычайнага гаражу на канцэрты зьбіралася публіка, колькасьць якой зрабіла б гонар менскім «4 апельсынам». Але ў сувязі з правакацыямі з боку уладаў сёньня далейшы лёс культавай пляцоўкі пад пытаньнем.

У *DIY* гуртоў няма сваіх студыяў або лэйблаў. Могуць быць толькі дыстро — каманды энтузіястаў, якія мэтанакіравана распаўсюджваюць прадукцыю (касэты й часопісы) па сабекошце.

Беларуская сетка распаўсюду *DIY* прадукцыі накрывае Менск, Гародню, Івацэвічы, Бярэсьце й яшчэ безьліч айчынных гарадоў. Яна шчыльна павязаная з адпаведнымі расейскімі й польскімі структурамі. Любы *DIY*-актывіст, едучы ў іншы горад, лічыць за справу гонару прыхапіць з сабой стос часопісаў і касэт, а назад прывезьці мясцовай прадукцыі. Гэтая сетка распаўсюду працуе значна лепей, чым афіцыйныя крыніцы інфармацыі. І самае галоўнае – інфармацыя непадцэнзурная.

Увогуле ж беларускі *DIY* зьяўляецца абсалютна сур'ёзнай і жыцьцяздольнай альтэрнатывай кволаму айчыннаму шоу-бізнэсу. Мары айчынных рокераў нарадзіць на беднай беларускай глебе «сапраўдную» камэрцыйную індустрыю не выклікаюць нічога, апроч усьмешкі. У сваю чаргу, тыя музыканты, хто робіць сваю справу не дзеля міфічнай славы альбо бабак, дасягаюць абсалютна рэальных вынікаў. І хай гурт *HATE TO STATE* ня ўдзельнічае ў БМАшных канцэртах, затое водгукі на ягоныя альбомы прыходзяць з самых розных канцоў сьвету, а інтэрвію Ігара Коніка друкавала больш за палову зінаў на тэрыторыі былога Савецкага Саюзу. Калі музыкант марыць толькі аб кліпе на расейскім *MTV*, ён ніколі не дасягне нічога. Калі ж чалавек сваімі сіламі выдае часопісы, выступае з канцэртамі й прапагандуе прагрэсыўныя ідэі, якія робяць навакольны сьвет хоць крыху лепшым, ніякага іншага посьпеху яму ўжо ня трэба. Ён робіць сваю справу й жыцьцёвых мэтаў дасягае сам. ■

ВЫСТАВА

У Гонар Дзядзькі Язэпа

ТАЦЦЯНА ПАЛЯКОВА

Рэспубліканская творчая суполка «Пагоня» зладзіла Шосты нацыянальны пленэр імя Язэпа Драздовіча.

Хто не ведае, Язэп Нарцызавіч Драздовіч, беларускі шляхціц з славутага роду. Нарадзіўся ў засценку Пунькі тагачаснага Дзісенскага павету Віленскай губерніі і вучыўся ў Віленскай мастацкай школе, пазней стаў заснавальнікам мастацкай студыі пры Віленскай беларускай гімназіі. Застаўся у гісторыі не толькі як выдатны графік, скульптар і мастак, але і як этнограф і даследчык старадаўняй архітэктуры Беларусі і Літвы.

Адкрыццё вернісажу адбылося 18 кастрычніка у Нацыянальнай мастацкай галерэі БСМ на вул Казлова, 3 і было ўпрыгожана выступам «Ліцвінаў», апранутых у святочную сялянскую вопратку і спяваўшых аутэнтычныя народныя песні.

А да таго, удзельнікі пленэру, а гэта сем мастакоў (Галіна Горава, Усевалад Грыцкевіч, Мікола Купава, Рыгор Мяжуеў, Алесь Суша, Яўген Шатохін, Валеры Шчасны) з Мінска, Пінска, Маладэчна, Дрысы правялі шмат часу ў родных мясцінах Язэпа Драздовіча, дзе не толькі папрацавалі пэндзлем, але і сустрэліся з зямлякамі дзядзькі Язэпа і наведалі ягоную магілу каля вёскі Ліпляны.

На выставе прадстаўлены лепшыя творы ўдзельнікаў за шэсць гадоў мастацкай працы. Дарэчы, 24 кастрычніка ў Нацыянальнай мастацкай галерэі БСМ адкрыецца юбілейная мастацкая выстава, прысвечаная 60-гадоваму юбілею Аляксея Марачкіна і 10-годдзю працы творчай суполкі «Пагоня». ■

АНОНСЫ

1 лістапада, ДК БелОГ (Уральская, 3), 19:00. **Прэзэнтацыя альбома легенды беларускай бардаўскай песьні** Сяржука Сокалава-Воюша **«Нефармальны Беларус». Кошт квітка ад 1000 да 4000.**

5 лістапада, ДК МТЗ, 19:00. **Сольны акустычны канцэрт культавай каманды** *N.R.M.* **Кошт квітка ад 3000 да 10 000. Набыўшым квіток за 10 000 у падарунак майка з сімволікай гурта.**

17 лістапада, парк-клюб «Менск», 18:00 - 22:00 . **Канцэрт прысьвечаны Дню Студэнта з удзелам гуртоў:** «НЕЙРО ДЮБЕЛЬ», *ZET, SPLENETIC, IMPETT, MARYLONG*. **Кошт квітка: 5000 (танцпол) – 7 000 (за столікам).**

22 лістапада, клюб «Рэактар», 18:00. **Прэзэнтацыя зборніка лепшых беларускіх metal-каманд** «Hard life–Heavy music». **Кошт квітка: 5000 (танцпол) – 7 000 (за столікам).**

HOMO LUDENS

«Что? Где? Когда?» — больше, чем игра

НИКОЛАЙ КОРНЕЙЧУКОВ

После смерти в марте этого года В. Я. Ворошилова у многих сложилось впечатление, что время «Что? Где? Когда?» закончилось. Но мрачные прогнозы не оправдались. Владимир Яковлевич умер, но дело его живёт.

Смерть Владимира Яковлевича вызвала в мире «Что? Где? Когда?» немало волнений. В России интеллектуальная элита была в трауре, а Международная ассоциация клубов «Что? Где? Когда?», которую возглавлял Ворошилов, даже ввела полугодовой мораторий на турниры по интеллектуальным играм. Обиднее всего пришлось питерским знатокам: «Кубок губернатора», ежегодные международные соревнования по «ЧГК», до начала которых оставалось каких-то три недели, пришлось перенести на осень.

Андрей Козлов, вице-президент МАК, пытался уговорить организаторов крупных белорусских турниров в Витебске и Гомеле отменить соревнования. Ничего не вышло, ведь у белорусов есть своя лига интеллектуальных команд – БЛИК, способная решать за себя. На смерть Ворошилова БЛИК отреагировала соболезнованиями оставшимся в живых и многочисленными минутами молчания, но турниров отменять не стала. В результате российские знатоки, соскучившись по игре, украсили своим участием белорусские турниры. Поначалу белорусы радовались неожиданной возможности помериться силами с грандами «Что? Где? Когда?». Радость сменилась разочарованием от собственной игры: российские знатоки оказались на голову выше большинства белорусских команд.

Противостояние недавно продолжилось на российской земле, где 13-14 октября всё-таки состоялся десятый «Кубок губернатора Санкт-Петербурга». Беларусь представляли 5 взрослых и 4 юношеские команды. В финал соревнований пробилась лишь команда одиннадцатиклассников из Лицея БГУ «Мафи», занявшая в итоге десятое место. Остальные команды расположились несколько ниже.

Серьёзный российский (и не только) интеллектуальный десант ожидается на международном турнире «Нестерка-2001», который начнётся в ближайшую пятницу в минском Дворце детей и молодёжи. Минск представляют 18 команд, всего же их будет около шестидесяти. Интеллектуальные баталии обещают разгореться не на шутку. Победит умнейший!

СПОРТОБЗОР

Есть парни в наших селеньях

До недавнего времени у белорусского тенниса была лишь одна легенда. Имя ей Наталья Зверева. Больше никто из отечественных мастеров ракетки не достигал подобных высот. Все остальные наши теннисисты почему-то оставались лишь подающими надежды. Разумеется, иногда они выстреливали, показывая очень неплохой результат, но потом опять уходили в тень. По настоящему стабильно на высоком уровне никто не выступал.

Похоже, что этой неприятной традиции суждено прерваться, и произойдет это благодаря первой ракетке белорусского тенниса Максиму Мирному. На протяжении всего года он показывает игру высокого уровня, в которой не хватало одного – результата. Высшим достижением Макса еще недавно считали его противостояние с первой ракеткой мира Густаво Куэртеном на Открытом чемпионате США. Несмотря на поражение в пяти сетах, Макс заслужил множество восторженных отзывов. Тогда казалось, что победы над такими мастерами – это пока слишком высокий для нашего теннисиста уровень.

Возможно, потому, для многих и стало сюрпризом выступление Максима Мирного на турнире серии «Мастерс» в Штутгарте с призовым фондом 2,95 миллиона долларов. Даже победа над тем же Куэртеном рассматривалась как обыкновенная случайность, никак не влиявшая на дальнейшие перспективы Макса в турнире. Ведь далее жребий определил ему в соперники Горана Иванишевича, Пита Сампраса и Евгения Кафельникова. Далеко не каждый именитый спортсмен мог бы с уверенностью сказать, что он пройдет это испытание. Шутка ли, на троих эти спортсмены уже выиграли девятнадцать турниров «Большого шлема». Тем значительнее выглядит успех нашего теннисиста, помимо высокого исполнительского мастерства продемонстрировавшего в этих поединках завидное хладнокровие и уверенность в своих силах.

Максиму так и не удалось довести столь удачно складывавшийся для него турнир до логического завершения. В финальном поединке наш спортсмен уступил немцу Томми Хаасу и, таким образом, довольствовался на турнире лишь победой в парном разряде вместе с австралийцем Сэндоном Столле. Несмотря на это, Макс смело может занести этот турнир себе в актив. А если его игра и дальше будет так прогрессировать, то победы на крупнейших турнирах не заставят себя ждать.

Без интриги

Наверное, канули в лету те времена, когда финиш футбольного первенства страны вызывал ажиотаж среди болельщиков. Нынешний чемпионат никаких интриг в последних турах не готовит. По большому счету, невыясненным остался лишь один вопрос: кому достанутся второе и третье места.

Согласитесь, сложно себе представить, как бобруйская «Белшина», уступившая в этом чемпионате лишь в двух поединках, вдруг проигрывает все три оставшиеся встречи и пропускает вперед борисовский «БАТЭ». Это притом, что борисовцы все свои поединки выигрывают. С аутсайдерами чемпионата еще проще. Даже стопроцентный результат в оставшихся турах не спасает новополоцкий «Нафтан» и речицкий «Ведри-97» от расставания с высшей лигой.

Что касается второго-третьего мест, то их между собой распределят борисовский «БАТЭ», минское «Динамо» и гродненский «Неман-Белкард». Именно эти клубы, наряду с «Белшиной», наиболее стабильно выступали на протяжении всего сезона и сейчас реально претендуют на вторую строчку турнирной таблицы, дающую право на выступление в Кубке УЕФА. Пока наиболее предпочтительными представляются шансы «БАТЭ», хотя достаточно будет одной оплошности любого из клубов, чтобы ситуации на вершине турнирной таблицы кардинальным образом изменилась.

Очередной, двадцать третий, тур чемпионата принес следующие результаты: «Неман-Белкард» – «Славия» 1:1, «Локомотив-96» – «Динамо» Мн. 1:3, «БАТЭ» – «Днепр-Трансмаш» 2:0, «Белшина» – «Молодечно-2000» 2:0, «Торпедо-МАЗ» – «Шахтер» 0:2, «Ведрич-97» – «Гомель» 2:4, «Нафтан» – «Динамо» Бр. 2:1.

Катастрофа в Мадриде

Есть виды спорта, в которых все практически всегда закономерно и предсказуемо. Одним из них, безусловно, является и художественная гимнастика. Число команд, способных претендовать на победу, составляют пять-шесть сборных, число которых не меняется годами. Еще более консервативна ситуация в одиночных разрядах. К нашему огромному удовольствию, к числу лидеров мировой художественной гимнастики смело можно отнести и нашу сборную. Результаты выступлений наших девушек на Олимпиаде в Сиднее и первенстве Европы в Женеве позволяли надеяться на высокие места и на чемпионате мира, который состоялся в Мадриде.

К сожалению, итоги мирового первенства для белорусской художественной гимнастики столь же катастрофичны, как и на Олимпиаде в Атланте в 1996 году. Единственным достижением белорусок стало третье место в командных выступлениях. В отдельных видах наши девушки так и не сумели приблизиться к призовым местам. И Леся Ткаченко, и Элона Осядовская смело могут занести это первенство себе в пассив. А еще лучше – забыть о нем и спокойно готовиться к новым стартам.

Дерзость не порок

Европейский футбол сейчас можно разделить на две неравные части: элита, состоящая из суперклубов, и все остальные. Первые доминируют как в своих национальных первенствах, так и на международной арене. Перечень этих команд известен каждому любителю футбола, и многие считают, что еще долгое время он не претерпит серьезных изменений. Однако этот сезон ставит под сомнение величие грандов. Но если к непредсказуемости борьбы в чемпионате Англии мы привыкли, если нестабильность мадридского «Реала» или «Барселоны» ни для кого не секрет, то события в первенстве итальянском всерьез тянут на сенсацию. После семи туров таблицу самого консервативного чемпионата Европы возглавляет новичок высшего дивизиона «Кьево».

Подготовил СЕРГЕЙ ВИТАЛЬЕВ

ПОНЕДЕЛЬНИК, 29 ОКТЯБРЯ



15.00, 18.00, 23.25 Новости.
15.15 Детективный сериал «Жюли лес-ко».
17.00 «Страсти». Сериал.
18.20 Зона Икс.
18.30 Познавательный сериал «Пятое измерение».
18.55 Боевик «Постовой на перекрест-ке».
20.45 Колыбельная.
21.00 Панорама. Информационный канал.
21.45 «Человек моря». Сериал.
22.30 Стадион.
22.55 Планета «Арт».



8.15 «Земля любви». Сериал.
9.15 «Каменская: шестерки умирают первыми».
10.20 Док. детектив. «Время разбрасывать камни». Дело Гохрана.
10.50 Библиомания.
14.55 «Вечный зов». Сериал.
16.00 Большая стирка.
17.25 «С легким паром!» В гостях у Михаила Евдокимова.
18.00 «Земля любви». Сериал.
19.00 Жди меня.
20.00 Время.
20.35 «Убойная сила-3. предел прочности».
21.45 Независимое расследование.
22.30 Ночное «Время».
23.00 «На футболе» с Виктором Гусевым.
23.40 «Паранормальные явления. Закрытое досье».



7.15 «Экспертиза ртр».
7.30 «Москва-Минск».
7.50 Вести-Москва.
8.15 Худ. фильм «Марс атакует».
10.30 Сатирический киножурнал «Фитиль».
10.55 Александр Самойленко в детективе «Кобра». Фильм 3-й. «Груз»
16.30 «Экспертиза ртр».
17.00 Мелодрама «Возвращение в эдем». Сериал.
18.00 Телесериал «Московские окна».
19.35 Местное время. Вести-Москва.
19.55 Дэвид Суше в детективе «Пуаро агаты кристи немой свидетель».
22.00 Вести+подробности.
22.30 Местное время. Вести - Москва.
22.40 Детектив «Ключи от рая».



11.30, 15.00, 17.30, 23.00 Новости культуры.
11.45 «Любовь». Худ. фильм.
13.10 «Футбольные звезды». Мультфильм.
13.30 Вместе с Фафалей.
13.45 Все суры Корана.
14.05 Живое дерево ремесел.
14.15 Архитектурная галерея.
14.30 «Осенние портреты». Спартак Мишулин.
15.10 «Магические приключения. прикосновение мидаса». Сериал.
15.35 Нобелевские лауреаты.
16.15 Концертино.
16.30 Alma Mater.
17.00 Археология. «Город богов».
17.50 «Век русского музея». Авторская программа В.Гусева.
18.15 «Будденброки». Сериал.
19.15 «Рыцарь балета». Михаил Лавровский.
19.45 Спокойной ночи, малыши!
20.00 «Цитаты из жизни».
20.40 «Опыт освоения «Чайки» системой Станиславского». Телеверсия спектакля Государственного Театра Наций.
21.35 «Что делать?»
22.30 От киноавангарда к видеоарту. «Время изображения пришло!».



7.30, 9.00, 11.00, 13.00, 15.00, 18.00, 21.00, 23.05 Сегодня.
7.55 Криминал. «Чистосердечное признание».
8.20 Служба спасения.
9.30 Намедни.
10.30 Куклы.
11.20 Комедия «Покровские ворота».
13.45 Сериал.
15.30 Сериал. «Салон красоты».
18.35 Герой дня.
18.55 Сериал «День рождения Буржуя-2».
20.00 Алчность.
21.55 Сериал «Скорая помощь»..
23.30–0.35 Гордон.



6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 10.00, 12.00, 14.00, 16.00, 18.00, 20.00 Сейчас.
6.10, 6.40, 7.10, 7.35 День за днем.
7.50 Назло.
8.25 Сериал «Сыщики».
9.35 Итого с Виктором Шендеровичем.
10.25 Сериал «Сыщики»:«Черт лысый».
11.30 «Все в сад!»
13.20, 17.10 «За стеклом».
14.35 Дорожный патруль.
14.55 100 чудес света: «Мексиканцы: как они себя видят».
16.35 Сериал «Самые громкие преступления хх века».
17.45 Дорожный патруль.
18.45 Сериал «Сыщики».
20.35 Тушите свет.
20.50 «Забытый полк».
22.00 Грани.
22.45 Чемпионат России по хоккею с шайбой. «Спартак» - «Цска».
23.50 «За стеклом».
0.20 Дорожный патруль.



8.00 «Тихие страсти магдалены». Сериал.
9.00 «Версты». Путешествие в Россию.
10.00 События. Время московское.
10.15 Петровка, 38.
10.25 Телеканал «Дата».
11.15 «Уроки русского».
11.35 «Момент истины».
12.30 Деловая Москва.
13.00 События. Время московское.
13.15 «Инспектор кресс». Сериал.
14.30 Худ. фильм «Большой вальс».
15.00 Регионы. прямая речь.
15.30 Мультпарад.
16.00 События. Время московское.
16.15 Москва Гиляровского.
16.45 «Генерал». Док. фильм.
17.15 «Антимония».
18.00 «Узурпаторша». Сериал.
18.50 Пять минут деловой Москвы.
19.00 События. Время московское.
19.40 Особая папка.
20.15 Родное кино.
22.15 Времечко.
22.45 Петровка, 38.
23.00 События. Время московское.
23.20 Ночной полет.
23.55–0.25 Музыкальный патруль.



6.30 «Школдливый пес». Мультсериал.
7.00 «Таинственные рыцари тир на ног». Сериал.
7.30 «Мурашки». Сериал.
8.00 Информационная программа.
8.15 Телеспецназ.
8.30 Мир спорта глазами «Жиллетт».
9.00 Комедия «Девять месяцев».
11.30 Случайный свидетель.
12.00 Информационная программа.
12.45 «Золушка в сапогах». Фильм.
14.05 «Гипноз». Фильм.
15.00 «Таинственные рыцари Тир На Ног». Сериал.
15.30 «Мурашки». Сериал.
16.00 «Школдливый пес». Мультсериал.
16.30 «Икс-мен». Мультсериал.
16.55 «Чертенок». Теленовелла.
19.00 «Симпсоны». Мультсерия.
19.30 Боевик «Враг моего врага».
21.40 «Пятый угол». Сериал.
23.00 Информационная программа.
23.45 Футбольный курьер.



5.35, 14.40 «Арабела возвращается». Детский телесериал.
6.05 «Счастливого пути!» Музыкальная программа.
6.20 «Голова на плечах». Молодежная программа.
6.35 Мультсериал «Приключения папируса».
7.00, 23.00 «Человек и море». Сериал.
7.30, 1.15 «Четыре танкиста и собака». Сериал.
8.40 Худ. фильм «Поколение».
10.00 «Счастливого пути!»
10.30 Научно-популярный сериал «Путеводитель для гурманов».
11.00 Мультсериал «Приключения папируса».
11.30, 14.30, 20.30, 2.30 «Факты дня».
11.45 Просто песня.
12.10, 23.55 «Джузеппе верди». Сериал.
13.35 «Петербургские портреты».
15.10 Канал QP.
15.35 Худ. фильм «Старая крепость».
17.00 Алло, Россия!
17.30 «Факт».
17.45 Постфактум.
18.00 Научно-популярный сериал «Путеводитель для гурманов».
18.30 «30случаев майора земана». Сериал. «1945 год. Смерть у озера».
19.35 «Петербургские портреты».
20.15 Вояж без саквояжа.
20.35 «Голова на плечах»
20.50 Худ. фильм «Поколение».
22.30 «Представляет большой...»
23.30 «Факт».
23.45 Постфактум.
2.10 «Голова на плечах».
2.35 «Представляет большой...»
3.00 «30 случаев майора земана». Сериал. «1945 год. смерть у озера».
4.05 Только для женщин.
4.30 Просто песня.

ВТОРНИК, 30 ОКТЯБРЯ



15.00, 18.00, 23.10 Новости.
15.15 «Дэнни, расскажи мне историю». Док. сериал.
15.25 «Все на орбиту!»
15.35 «Маленькие Эйнштейны». Сериал для детей.
16.10 «Пять чудес».
16.20 «5 х 5».
17.00 «Страсти». Сериал.
18.20 Зона Икс.
18.30 «Москва - минск».
18.45 «Франсуа-подкидыш». Худ. фильм.
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.45 «Человек моря». Сериал.
22.30 Спорт-курьер.
22.40 Ток-шоу «Дела житейские».



8.15 «Земля любви». Сериал.
9.15 «Каменская: шестерки умирают первыми».
10.20 «С легким паром!»
10.50 Библиомания.
14.55 «Вечный зов». Сериал.
16.00 Большая стирка.
17.25 Спасатели. Экстренный вызов.
18.00 «Земля любви». Сериал.
19.00 «Слабое звено». Игровое шоу.
20.00 Время.
20.35 «Убойная сила-3. спидвей».
21.45 Кремль -9. «Гараж особого назначения».
22.30 Ночное «Время».
23.00 Цивилизация.
23.35 Худ. фильм «Распутин».



8.15 Худ. фильм «Семейные тайны».
9.10 Диалоги о животных.
10.30 «Санта-барбара». Сериал.
16.30 «Экспертиза ртр».
17.00 Мелодрама «Возвращение в эдем». Сериал.
18.00 Телесериал «Московские окна».
19.35 Местное время. Вести-Москва.
19.55 Худ. фильм «Семейные тайны».
21.00 Док. фильм Алексея Денисова «Беларусь».
22.00 Вести+подробности.
22.30 Местное время. Вести - МОСКВА.
22.40 Худ. фильм. «Гонконгский клинок».



11.15 Мультфильм.
11.30, 15.00, 17.30, 23.00 Новости культуры.
11.45 «Остальное - молчание». Худ. фильм.
13.30 Вместе с Фафалей.
13.45 Дело житейское.
14.15 Власть факта.
14.30 Сценограмма.
15.10 «Магические приключения. Прикосновение мидаса». Сериал.
15.35 Документальный экран.
16.30 «Российский курьер». Можайск.
17.00 Археология. «Переправа ледниковой эпохи».
17.55 Премьера балетов Ролана Пети «Пиковая дама», «Пассакалия».
20.15 «Осень». Мультфильм.
20.45 «Гойя в бордо». Худ. фильм.
22.30 Форма. Ведущий В.Мизиано.



5.00, 5.30, 6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 9.00, 11.00, 13.00, 15.00, 18.00, 21.00, 23.05 Сегодня.
7.55 Сериал «Скорая помощь»..
9.30 Алчность.
10.15 Путешествия натуралиста.
11.20 Наше кино. Комедия «Покровские ворота».
13.45 Сериал.
15.30 Сериал «Салон красоты».
16.35 Сериал «День рождения Буржуя-2».
18.50 Футбол. Лига Чемпионов. «Локомотив» - «Реал».
21.55 Сериал «Скорая помощь»..
23.30 Гордон.
0.15 Дневник Лиги Чемпионов.
0.55–2.55 Футбол. Лига Чемпионов. «Ливерпуль» (Англия)-»Боруссия» (Дортманд, Германия).



6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 10.00, 12.00, 14.00, 16.00, 18.00, 20.00 Сейчас.
6.10, 6.40, 7.10 День за днем.
7.40, 20.35 Тушите свет.
7.50 Назло.
8.25 Сериал «Сыщики».
9.25 «Без галстука» с Ириной Зайцевой.
10.25 «Забытый полк» с Евгением Кириченко.
11.25 Катастрофы недели.
13.20, 17.10 «За стеклом».
14.35 Дорожный патруль.
14.55 100 чудес света: «Великолепные камни».
16.35 Сериал «Самые громкие преступления XX века».
17.40 Дорожный патруль.
18.45 Сериал «Сыщики».
